

# СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА, НОВЫЯ ПРАЕКТЫ І БЯСПЕКА

**Прэзідэнт заслухаў шэраг дакладаў па самых актуальных тэмах**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 КАСТРЫЧНІКА 2025 г. ЧАЦВЕР № 195 (30583)

# 150 МІЛЬЁНАЎ ПІСЬМАЎ У 220 КРАІН СВЕТУ

**Паштовыя паслугі застаюцца запатрабаванымі і неабходнымі**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Здавалася б, са з'яўленнем даступнага інтэрнэту паштовыя паслугі ўжо не настолькі запатрабаваныя, як яшчэ, скажам, трыццаць гадоў таму. Але гэта толькі здаецца. На самай справе пошта застаецца важным звяном сувязі для многіх людзей, выконвае важныя сацыяльныя функцыі, а паштальёны і цяпер жаданыя госці. Сусветны дзень пошты, які адзначаецца сёння, — прафесійнае свята для больш чым 17 тысяч работнікаў сферы.

СТАР. 14–15

ЯКІЯ ЦЭНЫ ЧАКАЮЦЦА НА БАРШЧОВЫ НАБОР



8–9

«ЧЫРВОНКА»

## РАСПРАЦАВАНА МАЛАДЫМІ

**Вучоныя-пачаткоўцы працуюць над праектамі, якія нясуць рэальную карысць**

У Нацыянальнай акадэміі навук урачыста ўзнагародзілі пераможцаў конкурсу «Сто інавацый маладых вучоных». Тэмы даследаванняў маладых навукоўцаў звязаны з сельскай гаспадаркай, медыцынай, харчовай прамысловасцю, аховай навакольнага асяроддзя, машынабудаваннем, лічбавымі тэхналогіямі і іншымі галінамі. Адно з абавязковых патрабаванняў пры падрыхтоўцы праектаў — магчымасць выкарыстання распрацовак у рэальным сектары эканомікі. Пазнаёміліся бліжэй з некаторымі работамі.



СТАР. 12

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25195>

9 771990 763008

# СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА,

## Прэзідэнт заслухаў шэраг дакладаў

Аб стане спраў у сферах, за якія адказваюць, Аляксандру Лукашэнку далажылі Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр Вальфовіч, кіраўнік спраў Прэзідэнта Юрый Назараў, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Юрый Горлаў.

**Юрый Горлаў далажыў кіраўніку дзяржавы аб заканчэнні ўборачнай кампаніі і завяршэнні сяўбы азімых.** Размова ішла і аб цэнтралізаванай закупцы хімікатаў для сельскай гаспадаркі. Далажана аб выкананні гэтага даручэння, якое раней было дадзена міністру. Асобнай тэмай дакладу стала дзейнасць стабілізацыйных фондаў.

**Галоўнай тэмай даклада Аляксандра Вальфовіча сталі вынікі сумеснага беларуска-расійскага вучэння «Захад-2025».** Дзяржсакратар падрабязна далажыў аб яго выніках і атрыманым вопыце, а таксама аб рэакцыі заходніх суседзяў з улікам іх надзвычайнай заклапочанасці напярэдадні вучэння. Яшчэ адной тэмай даклада сталі інцыдэнты з залётам на тэрыторыю Беларусі беспілотных лятальных апаратаў, якія перыядычна маюць месца. Як далажыў дзяржсакратар, сітуацыя кантралюецца на пастаяннай аснове.

**Свой даклад беларускаму лідару прадставіў Юрый Назараў. Гаворка ішла аб ходзе будаўніцтва аб'ектаў у сістэме Кіраўніцтва справамі, якое знаходзіцца на кантролі кіраўніка дзяржавы.** Прэзідэнт удзяляе вялікую ўвагу адпаведным праектам, бо вопыт іх рэалізацыі пасля плануецца распаўсюдзіць па ўсёй краіне. Яшчэ адной тэмай размовы стала сітуацыя ў сельгаспрадпрыемстве «АСБ-Агра Гарадзец», якое Аляксандр Лукашэнка нядаўна наведваў і выказаў сур'ёзную крытыку ў дачыненні да шэрагу недапрацовак. Юрый Назараў далажыў, што на дадзены момант зроблена для выпраўлення сітуацыі па ўказаных момантах. Яшчэ адна важная тэма — у развіццё праведзеных перагавораў Прэзідэнта Беларусі з султанам Амана. Гэта маштабны праект у сельскай гаспадарцы, які цяпер знаходзіцца на стадыі прапрацоўкі. Прапанавана рэалізоўваць яго ў Віцебскай вобласці на аснове вопыту сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Браслаўшчыны са структуры Кіраўніцтва справамі. Юрыю Назараву даручана вывучыць пытанне рэалізацыі гэтага праекта.

Некаторыя падрабязнасці сваіх дакладаў кіраўніку дзяржавы міністр, дзяржсакратар Савета Бяспекі і кіраўнік спраў раскрылі журналістам.

### УБОРКА ЗАВЯРШАЕЦЦА, АЗІМЫЯ АМАЛЬ УСЕ ПАСЕЯНЫ — БУДЗЕМ З УРАДЖАЕМ

«Сёння мы працягваем убіраць бульбу. Літаральна да 20 кастрычніка завершым. Працягваем убіраць і цукровыя буракі, падыходзім да паловы. І, як заўсёды, мы плануем завяршыць іх уборку ў аптымальныя тэрміны — да 7—10 лістапада. Акрамя таго, сёння ўжо ўбрана 60 % кукурузы на сілас. Нам засталося ўбраць 40 % кукурузы, да 1 лістапада мы гэту работу завершым», — паведаміў **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Юрый ГОРЛАЎ.** Па яго словах, сёлета плануецца нарыхтаваць 20,6 мільёна тон кукурузнага сіласу. Таксама ідзе нарыхтоўка сенажу, гэта, як правіла, бабовыя травы, якія трэба пакасіць да 10—15 кастрычніка. «Мы забяспечваем у поўным аб'ёме патрэбу нашай жывёлагадоўлі ў сіласе і сенажы. У цэлым мы плануем выйсці на 33 цэнтнеры кармавых адзінак на ўмоўную галаву. У гэтым годзе мы нарыхтуем кармоў больш, чым летась», — падкрэсліў міністр.



На стадыі завяршэння прэсаванне лёну. Юрый Горлаў адзначыў, што гэта работа будзе завершана ў лічаныя дні, застанецца задача на некалькі дзён — звезці лён. «Стала перад намі задача ў 180 тысяч тон ільнотрасты — і мы нарыхтуем гэтыя аб'ёмы, перапрацуем на нашых ільнозаводах і паставім неабходны аб'ём ільноваланка на перапрацоўку на Аршанскі льнокамбінат», — удакладніў кіраўнік Мінсельгасхарча.



Своечасовая сяўба азімых культур — залог будучага ўраджаю, зрабіў акцэнт Юрый Горлаў. «Мы ўжо завяршаем сяўбу. Па стане на 8 кастрычніка пасеялі 91 % плошчаў. Мінская, Брэсцкая і Гродзенская вобласці ўжо завяршылі сяўбу. Пакуль яшчэ працягваюць сеяць Віцебская, Магілёўская, Гомельская вобласці. У найбліжэйшы час па гэтых абласцях мы скончым сяўбу азімых культур», — расказаў ён. Міністр паведаміў, што сёлета азімы рапс быў пасеяны на плошчы 450 тысяч гектараў — гэта на 1,5 % больш за ўзровень мінулага года. «Усе вобласці пасеялі рапс своечасова. Таму мы чакаем сапраўды добры ўраджай у наступным годзе з улікам аптымальных тэхналагічных тэрмінаў сяўбы, у якія мы ўклаліся», — падкрэсліў Юрый Горлаў. У агратэхнічныя тэрміны пасеяны і азімая пшаніца, азімы ячмень. Цяпер працягваецца сяўба азімых трыцікале і жыта. Умовы надвор'я і тэхналагічныя тэрміны яшчэ дазваляюць высейваць гэтыя культуры.

Міністр звярнуў увагу, што з-за сёлетніх умоў надвор'я на 10—14 дзён зрушыліся ўсе тэрміны. «Але нават з улікам гэтага мы сёлета сеем з большымі тэмпамі, чым у мінулым. Мы правялі пэўную работу па мадэрнізацыі, па аснашчэнні нашай тэхнікі, умацаванні нашых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў — і ўжо бачым адчувальны вынік сёлета. Тэрміны меншыя, а працы зроблена больш. Трэба аддаць належнае нашаму кіраўніку дзяржавы за падтрымку аграпрамысловага комплексу, ураду нашай краіны і, вядома ж, людзям, якія выконваюць гэту работу», — падсумаваў кіраўнік Мінсельгасхарча. Паводле яго слоў, намечаны планы па далейшым перааснашчэнні трактарнага парка, яго ўзмацненні энерганасычанай тэхнікай. «Гэта дазволіць нам у наступным годзе пасеяць усе культуры, уключаючы азімыя жыта і трыцікале, да 1 кастрычніка», — дадаў Юрый Горлаў.

***Раней Прэзідэнт даручаў арганізаваць цэнтралізаваную закупку хімікатаў для сельскай гаспадаркі. Гэта пытанне таксама абмяркоўвалася на дакладзе ў кіраўніка дзяржавы.*** «Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання правяло цэнтралізаваную закупку рэгулятараў росту для рапсу, конкурс адбыўся. На сёння заключаюцца дагаворы, прэпараты ўжо пастаўляюцца на сельгаспрадпрыемствы, уносяцца паводле навуковых рэкамендацый і ў адпаведнасці з тэхналагічнымі тэрмінамі. Умовы надвор'я нам яшчэ дазваляюць гэта рабіць. Вядома, мы не стаялі на месцы, не чакалі правядзення працэдуры, сельгаспрадпрыемствы збольшага самастойна закуплялі гэтыя прэпараты, бо для рапсу, пасеянага ў першай дэкадзе жніўня, рэгулятары росту трэба было ўносіць ужо ў пачатку — сярэдзіне верасня. А цяпер падыходзяць тэрміны для азімага рапсу, які высейваўся ў канцы жніўня. І мы дзесьці першую, дзесьці другую апрацоўку ўжо будзем праводзіць прэпаратамі, атрыманымі з дапамогай цэнтралізаванай закупкі», — расказаў Юрый Горлаў. Паводле яго слоў, пачынаючы з 2026-га стаіць задача ўсе пестыцыды, якія выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы, закупляць цэнтралізавана. «Таму сёння я далажыў кіраўніку дзяржавы, што Мінсельгасхарч распрацоўвае нарматыўныя прававы акт, які нам дазволіць з наступнага года праводзіць цэнтралізавана гэту работу», — сказаў міністр.

***Аляксандр Лукашэнка часта звяртае ўвагу на работу стабілізацыйных фондаў, аб чым таксама ў сераду дакладваў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання.*** «Забеспячэнне насельніцтва агароднінай, бульбай — гэта найважнейшая задача нашай дзяржавы. Сёлета стабілізацыйныя фонды перафарміравалі ў дзяржзаказ, і сёння вытворцы плодаагароднінай прадукцыі і бульбы абавязаны паставіць той аб'ём, які неабходны для нашага насельніцтва. Праведзена вялікая работа сумесна з Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю, прыняты адпаведныя нарматыўныя дакументы, пасеяна неабходная колькасць агародніны, бульбы», — сказаў Юрый Горлаў.

Міністр прывёў прыклады з лічбамі: «Для задавальнення патрэб насельніцтва праз гандлёвыя сеткі і сацыяльныя аб'екты нам патрабуецца 59 тысяч тон бульбы, гэта літаральна 6 % ад аб'ёму вытворчасці — мы вырошчваем 1 мільён тон. Такая ж сітуацыя і па астатняй агародніне, па наборы для баршчу — морквe, капусце, цыбулі, сталовых бураках. Ад 12 % да 42 % мы закладваем у дзяржзаказ ад вытворчасці ўсёй агароднінай прадукцыі».

З яблыкамі сёлета сітуацыя крыху больш складаная, чым летась. «Праз замаразкі ў маі мы недаатрымаем той ураджай, які планавалі. Але 27 тысяч тон яблыкаў лёжкіх сартоў патрабуюцца па дзяржзаказе, а мы ў гэтым годзе маем 40 тысяч тон, гэта значыць, айчыннымі яблыкамі закрываецца неабходны аб'ём. Мы не кажам, што гэтым будзем абмяжоўвацца. Умоўна, у нас больш за 50 % яблыкаў лёжкіх сартоў вырабляецца ў Брэсцкай вобласці, вядома ж, адтуль іх будуць пастаўляць у іншыя рэгіёны. Могуць завозіцца і невялікі аб'ём імпарту, які таксама будзе прысутнічаць на нашых прылаўках, — растлумачыў кіраўнік Мінсельгасхарча. — Пытанне па стабілізацыйных фондах мы з міністрам антыманапольнага рэгулявання і гандлю практычна штодня трымаем на кантролі. Таму хвалявацца аб тым, што на прылаўках нашых крам будзе адсутнічаць тая ці іншая прадукцыя, абсалютна няма чаго. Прадукцыя маецца ў кратных памерах. Цэны вызначаны Мінсельгасхарчам, МАРГ узгадніў іх. Гэта тыя аптымальныя, адэкватныя цэны, якія складваюцца на рынку сёння».

### МАДЭРНІЗАЦЫЯ СЕЛЬГАСПРАДПРЫЕМСТВАЎ І ПАД'ЁМ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ



**Кіраўнік спраў Прэзідэнта Юрый НАЗАРАЎ** згадаў, што размова па «АСБ- Агра Гарадзец» была не вельмі простай. «У нас сёння ёсць праграма, як гэта прадпрыемства паставіць на добрыя рэйкі для таго, каб яно пачало зарабляць для свайго развіцця. Літаральна ўчора з аблвыканкамам і райвыканкамам праехалі па аб'ектах, намецілі шэраг мерапрыемстваў. Зараз мы алічбуем па тэрмінах і выдатках, якія неабходна зрабіць. І Прэзідэнта я запрасіў вясной прыехаць у «Гарадзец». Мы яму пакажам цалкам абноўленую, а дзесьці і новую інфраструктуру сельскагаспадарчай вытворчасці», — расказаў ён. Таксама размова ішла аб рэалізацыі іншых праектаў, у тым ліку і па выніках суботняй рабочай паездкі кіраўніка дзяржавы ў Лясковічы Петрыкаўскага раёна.

Што датычыцца дамоўленасцяў з аманскім бокам, Юрый Назараў расказаў, што цяпер сумесна з аманскім інвестарам у Браслаўскім раёне прапрацоўваецца маштабны праект у сельскай гаспадарцы. «Ёсць добрыя задумы, ёсць намеры. Мы цяпер у стане таго, каб іх адпрацаваць і алічбаваць, што з гэтага можа атрымацца. Ёсць некалькі варыянтаў. Прыцэл адзін — Аман адчувае дэфіцыт харчавання (гаворка пра патэнцыял сельскай гаспадаркі Амана, які не можа самастойна закрыць усе патрэбы краіны. — **«Зв.»**). У нас ёсць усе магчымасці для таго, каб тут вырошчваць і вырабляць тое, што ім трэба. Нешта ў плане вытворчасці прадуктаў харчавання», — сказаў кіраўнік спраў Прэзідэнта.

Таксама Юрый Назараў расказаў, што запрасіў Прэзідэнта наведаць Бярэзінскі біясферны запаведнік, у прыватнасці вёску Домжарыцы — цэнтр запаведніка. «Я запрасіў туды Прэзідэнта, каб паказаць, што такое комплекснае рашэнне для развіцця такіх тэрыторый. Домжарыцы — гэта цэнтр запаведніка, такая вёсачка ўдалечыні ад буйных населеных пунктаў. Чаму я запрасіў Прэзідэнта? Бо мы абнавілі вытворчую базу цалкам. Мы стварылі цэх перапрацоўкі драўніны. У любым выпадку ў запаведніку вядзецца догляд за лесам, атрымліваюцца бярвёны, якія трэба перапрацаваць у нешта. Мы практычна зноўку пабудавалі і аднавілі цэх. Вырабляем там не толькі дошку, якую можна экспартаваць. Мы выйшлі на вытворчасць садовай мэблі, якая патрэбна ў тым ліку гэтаму ж запаведніку для ўладкавання турыстычнай інфраструктуры», — расказаў Юрый Назараў. Ён дадаў, што ў населеным пункце сумесна з мясцовымі ўладамі абноўлена інфраструктура. Праведзена ў парадак аблічча самой вёскі, для турыстаў створаны ўмовы, якімі могуць карыстацца і мясцовыя жыхары. Аднаўлены Дом экалагічнай асветы, на важнасць якога Юрый Назараў звярнуў асаблівую ўвагу, паколькі

# НОВЫЯ ПРАЕКТЫ І БЯСПЕКА

## па самых актуальных тэмах

гэты цэнтр наведваюць дзеці. У населеным пункце актыўна будуецца жыллё, уведзены ў эксплуатацыю 24-кватэрны арэндны дом. «Мы не проста зазываем: «Прыходзьце да нас, мы вам дадзім працу і жыллё!» Мы ўжо ведаем па прозвішчах, хто ў якой кватэры жыве. А жыве ў асноўным моладзь. І там ужо з'яўляюцца шматдзетныя сем'і. Яны там выраслі, атрымалі адукацыю, вярнуліся на радзіму, уладкаваліся на работу, і ў іх нарадзілася трое і больш дзяцей. У Домжарыцах ёсць дзіцячы садок, школа. Такая інфраструктура з вытворчай базай дазваляе нам упэўнена развіваць гэты населены пункт», — расказаў Юрый Назараў.

Ён таксама далажыў кіраўніку дзяржавы аб развіцці сферы турызму на аб'ектах Кіраўніцтва справамі. Размова ішла аб санаторыях «Сосны» і «Прыазёрны». Асобна абмяркоўвалася развіццё санаторыя «Баравое» ў Докшыцкім раёне Віцебскай вобласці, дзе цяпер актыўна ідуць будаўнічыя работы, у выніку якіх плануецца ў паўтара раза павялічыць колькасць месцаў размяшчэння. «Гэта цягне за сабой усю інфраструктуру. У наступным годзе мы прывядзём у парадак гэты санаторый, які зможа быць самадастатковым. Бо пры той колькасці месцаў, якая ёсць сёння, ён не можа зарабляць для таго, каб развівацца далей», — падзяліўся падрабязнасцямі Юрый Назараў.

### ЗАДАЧЫ АБАРОНЧАГА ХАРАКТАРУ ВЫКАНАНЫЯ, ПРАЛЁТЫ БЕСПІЛОТНІКАЎ КАНТРАЛЮЮЦЦА



**Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ дакладваў Прэзідэнту аб выніках вучэння «Захад-2025» і аб асобных пытаннях забеспячэння бяспекі нашай дзяржавы.**

«Вучэнне праведзена. Усе пытанні, якія ставіліся на перыяд вучэння, у поўным аб'ёме адпрацаваныя, а мэты — дасягнутыя. Галоўнае, што паказала вучэнне, — вельмі высокі ўзровень падрыхтоўкі ваеннаслужачых Беларусі і Расіі», — адзначыў ён. Аляксандр Вальфовіч зрабіў акцэнт: пытанні, якія выносіліся на адпрацоўку ў вучэнні, мелі выключна абарончы характар. Ён нагадаў, што, як толькі было заяўлена аб правядзенні вучэння, на Захадзе пачалася сапраўдная істэрыя, аператыўна былі арганізаваны некалькі вучэнняў з колькасцю ваенных у разы большай, чым у вучэння «Захад-2025».



«Дык хто і каму ўяўляў пагрозу? — задаў рытарычнае пытанне Аляксандр Вальфовіч. — Ды і наогул тое, што мы бачым на тэрыторыі сумежных дзяржаў, тая рыторыка, якая гучыць ад нашых заходніх суседзяў, ад іх палітыкаў, не можа не выклікаць заклапочанасці. Мы бачым даклады палітычнага кіраўніцтва Польшчы, краін Прыбалтыкі, Германіі і іншых дзяржаў. Іх кіраўнікі кажуць пра пагрозу з усходу, мілітарызацыю, павелічэнне выдаткаў на ваенныя бюджэты. Дзе ў рыторыцы кіраўніцтва калектыўнага Захаду пытанні, звязаныя з сацыяльна-эканамічным развіццём іх краін, паляпшэннем дабрабыту грамадзян, будаўніцтвам аб'ектаў грамадзянскай інфраструктуры? Наогул не чуваць». Аляксандр Вальфовіч адзначыў, што ў процівагу гучыць рыторыка кіраўніцтва Беларусі, дзе ў цэнтры ўвагі — развіццё краіны і павышэнне дабрабыту грамадзян. Але пры гэтым, зрабіў акцэнт дзяржсакратар, кіраўнік дзяржавы дэталёва ўнікае ў пытанні ваеннай бяспекі, чаму і быў прысвечаны даклад Дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі. Аляксандр Вальфовіч нагадаў, што пры падрыхтоўцы і правядзенні вучэнняў усё было адкрыта, ад суседзяў і насельніцтва не хавалі, што запланавана на гэты перыяд. Мэты, маштабы, колькасць ваеннаслужачых не ўтойваліся, запрашалі журналістаў, ваенных аташэ з розных краін.

Падводзячы вынікі вучэння «Захад-2025», Аляксандр Вальфовіч распавёў аб дасягненні яшчэ аднаго выніку, які першапачаткова не планаваўся: «Гэта развянчанне тых фэйкаў пра гэта вучэнне, якія былі сфармаваныя на Захадзе: што мы ствараем групоўкі абавязкова для наступлення на Еўропу, захопу нейкіх заходніх тэрыторый і граніц (якія нам апрыёры не патрэбныя, і пра гэта Прэзідэнт увесь час гаворыць). Нам хапае нашай зямлі, якую мы любім, цэнім і будзем, вядома, абараняць усімі магчымымі сродкамі і спосабамі. А мы гэта ўмеем рабіць».

Дзяржсакратар адзначыў, што групоўкі войск — як Расійскай Федэрацыі, так і Рэспублікі Беларусь — усе вярнуліся ў пункты пастаяннай дыслакацыі. То-бок сёння ніводнага расійскага салдата, які знаходзіўся на вучэнні, на тэрыторыі Беларусі няма.

***Адной з тэм даклада Прэзідэнту сталі інцыдэнты з залётам на тэрыторыю Беларусі беспілотных лятальных апаратаў, якія перыядычна маюць месца.*** «Ваенна-палітычнае становішча, якое складваецца вакол нашай краіны, перш за ўсё на фоне правядзення спецыяльнай ваеннай аперацыі ва Украіне, паказвае, што сёння сродкі ўзброенай барацьбы некалькі змяніліся і прымяненне беспілотнікаў сёння выйшла на першы план, — адзначыў Аляксандр Вальфовіч. — Мы фіксуем, што кожныя суткі Расія і Украіна ўжываюць на сваёй тэрыторыі вялікую колькасць беспілотных лятальных сродкаў».

Дзяржаўны сакратар звярнуў увагу, што створаная ў Расіі групоўка сродкаў радыёэлектроннай барацьбы (РЭБ) для процідзеяння беспілотным лятальным сродкам уплывае на траекторыю палёту гэтых беспілотнікаў. «Таму, я б сказаў, па аб'ектыўных прычынах частка гэтых беспілотнікаў залятае на ўсходнія граніцы нашай дзяржавы. Усё, што залятае і знаходзіцца ў паветры на тэрыторыі нашай краіны, нашы сродкі радыёэлектроннага кантролю, радыётэхнічныя сродкі разведкі — мы ўсё гэта фіксуем і ўсё мы бачым», — патлумачыў ён. Аляксандр Вальфовіч падкрэсліў, што ў Беларусі таксама створана групоўка сродкаў РЭБ, якая ўплывае на беспілотнікі і не дае ім магчымасці лятаць адвольна па тэрыторыі краіны. «Мы гэта ўсё бачым, прымаем адэкватныя меры, уздзейнічаем сродкамі радыёэлектроннага падаўлення на пралёт беспілотнікаў. Калі бачым, што яны пагражаюць нейкім крытычна важным аб'ектам, гарадам, насельніцтву, падымаецца баявая авіяцыя і ўжываецца баявая зброя знішчэння і падаўлення беспілотнікаў», — заявіў ён.

Разам з тым, зрабіў акцэнт дзяржсакратар, беспілотная авіяцыя ідзе навыперадкі са сродкамі РЭБ — хто каго абгоніць. Як толькі апошнія знаходзяць спосаб падаўлення, кантролю, першыя мяняюць частоты, ужываюць новыя тэхналогіі. Так адбываецца ў свеце. «Самая галоўная задача сёння — процідзейнічаць і забяспечыць бяспеку нашых грамадзян і тэрыторыі, для чаго прымяняюцца ўсе магчымыя меры. І гэта кіраўнік дзяржавы трымае на самым жорсткім кантролі», — падкрэсліў дзяржсакратар.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

ПА СУТНАСЦІ

# ГАСПАДАРЫ НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ



Прэзідэнт пастаянна заняты справамі. Гаспадарчая рыса. Паспрабуй на зямлі прамарудзіць. Не дагоніш час. Таму і няма спакою. Асабліва зараз, пры цяперашнім глабальным перадзеле. Трэба ісці наперад — гэта жыццёвае крэда нашага Першага.

Так, па знешнім контуры мы забяспечваем стабільнасць (далёка не заўсёды ведаем, якімі намаганнямі гэта даецца). А ўнутраныя рэзервы развіцця — яны напрамую залежаць ад кожнага з нас. Беларусь у тэхналагічным пуле, эканоміку паслуг паспяхова развіваем. Але Прэзідэнт настойвае: трэба прыземлена глядзець на сітуацыю. Не трэба шыку — патрэбны парадак.

Першы не стамляецца на канкрэтных прыкладах паказваць шлях да поспеху. Салігорск — шахцёрская сталіца краіны. Тут працуюць шэраг стратэгічных прадпрыемстваў. Але развіццё і рост — у новых кампетэнцыях. Памятаеце, Прэзідэнту часта прапаноўвалі: навошта развіваць, можна купіць. Але мы пайшлі іншым шляхам. Час паказаў — беларусы зрабілі правільны выбар: усё, што можна зрабіць, спрабуем рабіць. І цяпер гэта падаецца такім звыклым. Напрыклад, як свой легкавы аўтамабіль.

Цяпер варта арганізаваць і сваю перапяліную вытворчасць. Так, смакавыя перавагі беларусаў становяцца больш патрабавальнымі. Тым больш мы можам стаць сур'ёзным экспарцёрам. Але каб прайсці гэты шлях ад пачатку і да канца, трэба стварыць селекцыйна-генетычны цэнтр па вырошчванні перапёлак. Цяпер куранят прывозяць з-за мяжы, а айчынная птушкагадоўля залежыць ад імпарту. Пакуль. Прэзідэнт узяўся і за гэтую справу.

А на наступны дзень кіраўнік дзяржавы ўжо на Палессі. Цяпер тут, у пойме Прыпяці, што называецца «кінуў якар» аграхолдынг Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта. Шчодрымі гэтыя землі не назавеш. Але гэта сапраўдны палігон для выпрабавання навацый у АПК. А пасля, калі досвед будзе паспяховым, яго будуць укараняць паўсюдна.

Само Палессе — сімвал паспяховага развіцця краіны. З яго ж усё пачыналася, калі быў час не толькі развалу, але і спадзяванняў. Дзяржава тады не проста падставіла плячо, але і задала трэнд — аграрны суверэнітэт. Трэба ісці далей, каб да лапцей не вярнуцца. Будзем шчырыя, калісьці і Палессе асацыіравалася з лапцямі. А пазней з чарнобыльскай трагедыяй. А зараз — гэта брэнд Беларусі.

Палёт працягваецца, і нас не збіць з гэтага курсу. Усё прайшлі, усё перажылі — і разбуральныя «чарнобыльскія маршы», і недавер, і неспакой... І гэтае чарговае скрыжаванне адолеем. Ёсць за кім ісці.

Такой жа ўцягнутасці ў працэс кіраўнік дзяржавы мае права патрабаваць і ад вертыкалі. Унутраныя рэзервы развіцця ў тым ліку залежаць і ад парадку на кожным прадпрыемстве, у кожнай гаспадарцы. Усё залежыць ад кіраўнікоў і тых, хто побач з імі. А як інакш?

Сярод каланіяльных дзяржаў, у гонцы з наднацыянальнымі элітамі, транскарпарацыямі нам на гэтым скрыжаванні неабходна захаваць сябе. Каб стаць лепшымі, больш канкурэнтаздольнымі, а значыць мацнейшымі. А за карпатлівую працу заўсёды будзе годная ўзнагарода. Калі па-гаспадарску ставіцца да справы. Тут варта ўзгадаць нашы «Дажынкі», якія цяпер праходзяць у рэгіёнах. І да кожнага з іх Прэзідэнт звяртаецца з душэўнымі словамі ўдзячнасці і павагі. Мне здаецца, што для Першага менавіта паездкі «па палях» заўжды вясна душы. І размова з простымі беларусамі. Нездарма ж самыя запамінальныя для яго фатаграфіі, на якіх ён сярод людзей. У гэтым соль палітыкі Лукашэнкі. Сіла, што дапамагае пераадолець любыя скрыжаванні беларускага шляху. Каб быць сапраўднымі гаспадарамі на сваёй зямлі.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Несвижский райагросервис»** (Продавец) на праве собственности.

**Электронные торги состоятся 30.10.2025 в 11.00.**

**Лот № 1:** Свеклоуборочный комбайн Holmer Terra Dos 2, заводской № 243808, 2008 г. в.
Начальная цена – 99 144,00 с учетом НДС 20 %.
Задаток – 10 000,00 руб.

**Лот № 2:** Трактор К 701, заводской № 9103073, 1991 г. в.
Начальная цена – 14 282,00 с учетом НДС 20 %.
Задаток – 2 500,00 руб.

**Лот № 3:** LADA 212140, кузов (рама) № XTA212140H2287388, 2017 г. в.
Начальная цена – 12 720,00 с учетом НДС 20 %.
Задаток – 2 500,00 руб.

**Местонахождение Лотов №№ 1-3:** Минская область, Несвижский район, деревня Рудавка, ул. Ленинская, 162.

**Шаг электронных торгов – 5 %.**

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **28.10.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Белресурсы» – управляющая компания холдинга «Белресурсы»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 23.10.2025.**

**Лот № 1:** MAZ 6516A8-321, Y3M6516A8C0000414, 2012 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 62 016,00 руб.
Задаток – 6 202,00 руб.

**Лот № 2:** MAZ 6516A8-321, Y3M6516A8D0000416, 2013 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 62 016,00 руб.
Задаток – 6 202,00 руб.

**Лот № 3:** Амкодор 352С, Y352C0000140873, 2014 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 94 248,00 руб.
Задаток – 9 425,00 руб.

**Местонахождение:**
Лоты №№ 1,2 – г. Минск, ул. Казинца, 4,
Лот № 3 – г. Минск, ул. Бабушкина, 24.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **21.10.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ВТОРЫХ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ в форме очного аукциона в процедуре банкротства по делу № 130-16Б/2018 в экономическом суде Гомельской области**

*Ранее опубликованное извещение о проведении аукциона размещено 21.08.2025 в газете «Звязда» № 160 (30548), стр. 11.*

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия и порядок проведения аукциона, информация об имуществе размещены на сайте организатора аукциона ООО «Индустрия Инноваций» https://iin.by, а также на bankrot.gov.by.

**Аукцион состоится 23.10.2025 по адресу: 220002, г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, начало: 11.00.**

Время приема заявок: **с 09.10.2025 09.00 до 22.10.2025 г. 16.00.**
Контакты: тел.: **+375 (29) 671-83-95**; e-mail: **e.pinchuk@iin.by.**
УНП 100078303

МІЖНАРОДНЫ ВЕКТАР

# НАРОДНАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ

## У Палаце прадстаўнікоў адбылася сустрэча з парламентарыямі

На пачатку сустрэчы Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА выказаў спачуванне в'етнамскім калегам, у цэлым народу гэтай краіны ў сувязі з трагічнымі наступствамі тайфуну, які абрынуўся на паўночныя і цэнтральныя раёны сацыялістычнай рэспублікі, пазбавіў жыцця дзясяткі людзей, нанёс сур'ёзную эканамічную шкоду. Спікер пажадаў в'етнамскаму народу, стойкаму ва ўсіх цяжкасцях, хутчэй аднавіць у гэтых раёнах нармальнае жыццё, а таксама далейшага росквіту і дабрабыту і краіне, і непасрэдна гэтым правінцыям.

«Беларусь надае важнае значэнне выбудоўванню эканамічных і гуманітарных адносін, у цэлым сяброўскім кантактам з В'етнамам, — акцэнтаваў увагу Ігар Сергяенка. — Сёлета нашы адносіны выйшлі на новы ўзровень дзякуючы кантактам і ўзаемадзеянню нашых лідараў — Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Генеральнага сакратара Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі В'етнама То Лама. Візіт Генеральнага сакратара, які адбыўся ў маі гэтага года, фактычна адкрыў новую старонку ў нашым супрацоўніцтве: было падпісана Пагадненне аб стратэгічным партнёрстве — гэта больш высокі ўзровень нашага ўзаемадзеяння».

Кантакты, якія склаліся паміж беларускімі і в'етнамскімі парламентарыямі на ўзроўні груп дружбы, з'яўляюцца важнымі і перспектыўнымі. Гэта першы візіт членаў групы дружбы «В'етнам — Беларусь» у нашу краіну.

«Мы ўспрымаем гэта як далейшы крок па развіцці нашых адносін, — канстатаваў Ігар Сергяенка. — Групы дружбы павінны паставіць на жорсткі кантроль выкананне сумесных рашэнняў, якія прымаюцца кіраўніцтвам нашых заканадаўчых органаў. Таксама разлічваем на працяг канструктыўнага ўзаемадзеяння з парламентам В'етнама ў рамках міжнародных арганізацый, у тым ліку ў адстойванні шматбаковых падыходаў, непрымальнасці эканамічных санкцый у мэтах аказання ціску на дзяржавы».

«Прыярытэтным кірункам для абедзвюх краін, у тым ліку парламентаў, з'яўляецца далейшае развіццё дагаворна-прававой базы, — адзначыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Зусім нядаўна ўступіла ў сілу Пагадненне аб адмене віз для ўладальнікаў нацыянальных пашпартоў. Упэўнены, што ў найбліжэйшы час мы адчуем аддачу: рост турызму, дзелавых паездак і нашых грамадзян, і жыхароў В'етнама ў нашу краіну. Літаральна на наступным тыдні з Мінска адправіцца першы прамы авіярэйс на Фукуок».

Ігар Сергяенка выказаў упэўненасць, што ў ходзе візіту члены групы дружбы «В'етнам — Беларусь» будуць мець магчымасць абмеркаваць усе пытанні, якія іх цікавяць, і выбудаваць далейшую работу.

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# «ДЫЯЛОГУ БЕЛАРУСІ І АМАНА САПРАЎДЫ ДАВЕРНЫХ

## Эксперты — аб узаемадзеянні афіцыйных Мінска і Маската

Два насычаныя дні ўзаемадзеяння лідараў Беларусі і Амана — Аляксандра Лукашэнкі і Хайсама бен Тарэка Аль Саіда — былі накіраваны галоўным чынам на паглыбленні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Нагадаем, дарожная карта паміж Беларуссю і Аманам, якая складзена ўрадамі дзвюх дзяржаў, уключае ў сябе пытанні інвестыцый, эканомікі, гандлю, прамысловай кааперацыі, лагістыкі, турызму, адукацыі, аховы здароўя і гэтак далей. Эксперты расказалі, чаму выбар Аманам стратэгічнага партнёра на еўрапейскім кантыненце быў зроблены на карысць Беларусі.

### ЭКАНАМІЧНЫЯ КАНТАКТЫ МАЮЦЬ ВАЖКІЯ ПАДСТАВЫ



**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, генеральны дырэктар Гомельскага гандлёва-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Фармацыя» Людміла САПЕГА** робіць акцэнт на тым, што кіраўніцтва гэтай арабскай краіны з 2016 года ўзяло курс на дыверсіфікацыю сваёй эканомікі.

— Доўгі час асновай дабрабыту Амана з'яўляўся экспарт нафты, — расшыфроўвае свой тэзіс сенатар. — Аднак па меры змяншэння яе запасаў кіраўніцтва краіны прыйшло да высновы аб неабходнасці развіцця іншых сектараў: апрацоўчай прамысловасці, сельскай гаспадаркі, рыбалоўства, турызму, што адкрывае для патэнцыяльных партнёраў шырокае акно магчымасцяў. Беларусь — адна з першых дзяржаў Еўропы, якая вырашыла ў поўнай меры гэтай магчымасцю скарыстацца, зразумела, для ўзаемнай карысці і выгады. Як было адзначана падчас сустрэчы нашага Прэзідэнта з султанам Амана, цяпер у гэтай краіне рэалізуюцца некалькі сумесных праектаў, а таксама плануецца стварэнне хаба па прасоўванні беларускай прадукцыі. Прычым не толькі на ўнутраны рынак Амана, але і на суседнія краіны Аравійскага паўвострава — Саўдаўскую Аравію, ААЭ, Емен. Гэта адносіцца не толькі да паставак харчовых тавараў, але і да стварэння сумесных зборачных вытворчасцяў і продажаў тэхнікі МАЗ і «Амкадор», паставак лекавых прэпаратаў беларускай вытворчасці, развіцця супрацоўніцтва ў сферы турызму, спорту і культуры. Са свайго боку Аман гатовы ўкласці інвестыцыі ў беларускую дрэваапрацоўчую прамысловасць, што дасць магчымасць больш эфектыўна выкарыстоўваць нашы прыродныя багацці.

Пры гэтым парламентарый адзначае, што эканамічныя кантакты паміж нашымі краінамі маюць пад сабой дастатковыя важкія падставы.

— Беларусь — краіна, якая не валодае багатымі прыроднымі рэсурсамі, што, аднак, не перашкодзіла нам за гады прэзідэнцтва Аляксандра Лукашэнкі стаць адной з самадастатковых дзяржаў Старога Свету ў плане дабрабыту. Вопыт, набыты нашай краінай у справе адраджэння і развіцця айчыннай эканомікі, а таксама імідж беларусаў, як адказных і абавязковых дзелавых партнёраў, напэўна, паўплываў на рашэнне султана Амана пры выбары стратэгічнага партнёра на еўрапейскім кантыненце, — падкрэслівае парламентарый.

### АДКРЫЦЬ ДАДАТКОВЫЯ БІЗНЕС-МАГЧЫМАСЦІ



Што датычыцца рэалізацыі дамоўленасцяў па пастаўках прамысловай тэхнікі, у эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» **першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Надзея ЛАЗАРЭВІЧ** выказала ўпэўненасць, што агучаныя на сустрэчы прапановы будуць у хуткім часе выкананы.

— Як сказаў кіраўнік дзяржавы, усё, што абяцаюць беларусы, заўсёды робіцца.

Таму што, як патлумачыла госця праграмы, для Беларусі вельмі важная кожная магчымасць прадстаўлення і збыту нашай прадукцыі. Па словах Надзеі Лазарэвіч, першы крок на шляху да супрацоўніцтва быў зроблены Прэзідэнтам падчас яго візіту ў гэты рэгіён. Цяпер жа, адзначыла яна, час профільных міністраў зафіксаваць і афарміць пагадненні, якія будуць выконвацца ў найбліжэйшыя гады.

— Беларускі хаб у Персідскім заліве — гэта дадатковыя магчымасці для нас па выкарыстанні новых лагістычных шляхоў, павелічэнні таваразвароту з Аманам і з найбліжэйшымі краінамі, — дадала госця праграмы. — Стварэнне хаба яшчэ раз пацвярджае, што Аман з'яўляецца для нас стратэгічным партнёрам. Ён адкрые дадатковыя перспектывы для Беларусі і Амана. Я ўпэўнена, што бізнес будуецца, калі ёсць узаемавыгадныя ўмовы для абодвух бакоў. Так што гэта выдатны прыклад таго, як патэнцыял Беларусі і Амана будзе раскрыты дзякуючы беларускаму хабу, створанаму на дадзенай тэрыторыі.

Акрамя гэтага, падкрэсліла Надзея Лазарэвіч, бязвізавы рэжым паміж

# ВЫСОКАГА ЎЗРОЎНЮ

## В'етнама


Фота БелТА.

«Гэта і пытанні, якія датычацца актывізацыі гандлёва-эканамічнага, навукова-тэхнічнага, культурнага супрацоўніцтва, іншых кірункаў, па якіх мы можам як парламентарыі зрабіць свой унёсак, — канкрэтызаваў спікер. — У нас яшчэ ёсць рэзервы для актывізацыі міжрэгіянальнага супрацоўніцтва».

У гэтым Ігар Сергяенка пераканаўся асабіста, калі падчас візіту ў В'етнам для ўдзелу ва ўрачыстых мерапрыемствах з нагоды 80-годдзя Аўгустоўскай рэвалюцыі і Дня Незалежнасці гэтай краіны наведваў правінцыю Лаакай.

**Кіраўнік парламенцкай групы дружбы «В'етнам — Беларусь», намеснік старшыні Камітэта Нацыянальнага сходу Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам па справах дэпутатаў Туан Ань НГУЕН** звярнуў увагу на тое, што В'етнам заўсёды імкнецца да цеснага супрацоўніцтва з Беларуссю па розных кірунках. «Напрыклад, па каналах партый, урадаў, народнай дыпламатыі», — канкрэтызаваў ён.

Кіраўнік парламенцкай групы дружбы нагадаў, што дыпламатычныя адносіны Беларусі і В'етнама пачаліся ў студзені 1992 года. «Палітычнае ўзаемадзеянне паміж дзвюма краінамі заснавана на традыцыйным сяброўстве, даверы і ўзаемаразуменні, — падкрэсліў ён. — Мы заўсёды падтрымліваем адзін аднаго на самым высокім узроўні. Пацвярджаем, што в'етнамскі народ ніколі не забудзе вашу дапамогу ў самыя складаныя гады. Будзьце ўпэўнены ў тым, што мы гэта заўсёды будзем памятаць і будзем за гэта ўдзячныя».

**Вераніка КАНЮТА.**

# НАКАНАВАНА СТАЦЬ ПРЫКЛАДАМ АДНОСІН»

## і чаканнях ад дасягнутых дамоўленасцяў

краінамі дасць бізнесу магчымасць хутка рэагаваць на запыты, а таксама дазволіць павялічыць турыстычны паток. Са слоў першага намесніка Мінгарвыканкама, беларусы, у асноўным людзі працаздольнага ўзросту, ужо адпачываюць у рэгіёне.

— І я ўпэўненая, што тыя бізнесмены, якія паехалі туды перш за ўсё як турысты, змогуць адкрыць для сябе нейкія дадатковыя бізнес-магчымасці. Бязвізавы рэжым — гэта палёгка сітуацыі і для нас, і для Амана. У жыхароў Амана з'явілася магчымасць адкрыць для сябе турыстычную Беларусь.

Надзея Лазарэвіч таксама адзначыла, што актыўна развіваецца супрацоўніцтва з Аманам у розных галінах, уключаючы фармацэўтыку і прамысловасць, і, на яе думку, верагодна развіццё ў сферы нафтахіміі.

— Аман цікавіць тэхніка МАЗа і «Амкадора». Я думаю, што яна будзе пастаўляцца ў рэгіён, і, магчыма, будуць створаныя сумесныя прадпрыемствы. Акрамя гэтага, я ўпэўнена, што Аман праявіць цікавасць да супрацоўніцтва ў сферы медыцынскай адукацыі.

### МІНСК І МАСКАТ СТАНОВЯЦЦА БЛІЖЭЙ



**Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Аляксандр ШПАКОЎСКІ** звяртае ўвагу на той факт, што кантакты на вышэйшым узроўні набралі досыць высокую інтэнсіўнасць.

— Натуральна, такога роду перагаворы (калі мы гаворым пра перагаворы на вышэйшым узроўні) — гэта ўжо пэўны вынік раней праведзенай працы. Гэта значыць, да моманту перагавораў кіраўнікоў дзяржаў фарміруецца партфель палітычных і гандлёва-эканамічных дамоўленасцяў.

Прынята палітычнае рашэнне аб арганізацыі Пасольства Рэспублікі Беларусь у Султанаце Аман. Гэта следства высокага ўзроўню даверу паміж дзяржавамі і ацэнка перспектыўнасці сувязі з Султанатам Аман з боку афіцыйнага Мінска. Звычайна мы перспектыўныя гандлёва-эканамічныя кантакты суправаджаем на палітыка-дыпламатычным узроўні. Для гэтага неабходна, каб праца ў Султанаце Аман была арганізавана непасрэдна з пазіцый беларускага пасольства ў Маскаце, а не з пазіцыі пасольства, размешчанага ў іншай краіне, але акрэдытаванага на Султанат Аман, як гэта ёсць на сённяшні дзень.

Парламентарый падкрэслівае: такім чынам беларускі бок павышае ўзровень сваёй палітыка-дыпламатычнай прысутнасці.



**Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы, член рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентам Султаната Аман Святлана АДЗІНЦОВА** звяртае ўвагу на тое, што перагаворы лідараў дзвюх дзяржаў — Рэспублікі Беларусь і Султаната Аман — маюць гістарычнае значэнне і вось чаму.

— Так як міждзяржаўнае ўзаемадзеянне вызначалася паслядоўна, і на глебе стварэння ўзаемнай павагі інтарэсаў дзяржаў, народаў гэта мае далейшы стратэгічны кірунак. Вызначаны дарожныя карты, шляхі іх вырашэння, годнае месца займае медыцынскі турызм, так як развіццё аховы здароўя ў нашай краіне дасягнула высокіх вынікаў у анкалогіі, кардыялогіі, трансплантalogіі. Неабходна адзначыць вобласць аховы мацярынства і дзяцінства, прафілактыку інфекцыйных захворванняў і развіццё фармацэўтычнай прамысловасці.

На думку парламентарыя, кірунак медыцынскага турызму можа служыць платформай для ўзаемнага супрацоўніцтва на шляху ўмацавання здароўя народаў Беларусі і Амана.



У сваю чаргу **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Аляксандр КАРПІЦКІ** працягвае тэму гуманітарнага вымярэння партнёрства.

— Важна, што супрацоўніцтва выходзіць за эканамічныя рамкі, — лічыць эксперт. — Увядзенне бязвізавага рэжыму і запуск прамых авіязносін паміж сталіцамі адкрываюць новыя магчымасці для развіцця турызму, умацавання чалавечых і культурных сувязяў.

Парламентарый звяртае ўвагу, што перспектывы ўзаемадзеяння ў сферах адукацыі, аховы здароўя і культуры, уключаючы абмен вопытам пры будаўніцтве новага Нацыянальнага музея гісторыі Беларусі, закладваюць трывалы падмурак для доўгатэрміновага збліжэння нашых народаў.

— Як адзначаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, для Беларусі ў тым рэгіёне няма больш блізкай краіны, чым Аман. Гэты візіт і падпісаныя дакументы — пераканаўчы доказ таго, што наша краіна, прытрымліваючыся курсу кіраўніка дзяржавы, паслядоўна пашырае геаграфію раўнапраўнага і ўзаемавыгаднага партнёрства, нягледзячы на любое недружалюбнае знешняе асяроддзе, — падкрэсліў суразмоўца.

У завяршэнне ён выказаў упэўненасць, што дыялогу Беларусі і Амана наканавана стаць прыкладам сапраўды даверных адносін, а ўсе дасягнутыя дамоўленасці будуць неўхільна рэалізаваны ў тэрмін.


**Закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»**

www.bsb.by

Форма 1

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
за 30 сентября 2025 года

Закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 30 сентября 2025 г. | 1 января 2025 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 320 237 | 451 734 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 8 855 | 7 042 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 306 247 | 226 370 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 329 378 | 296 531 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 112 301 | 121 750 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 136 665 | 112 070 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 35 | 35 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 67 469 | 65 443 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | 69 | 69 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 22 271 | 36 435 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 1 303 527 | 1 317 479 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | 40 | 40 |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 194 | 15 267 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 1 048 782 | 1 095 048 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 10 980 | 11 086 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 1 059 996 | 1 121 441 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 22 900 | 22 900 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 23 295 | 17 276 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 43 925 | 45 711 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 153 411 | 110 151 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 243 531 | 196 038 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 1 303 527 | 1 317 479 |

Форма 2

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
за 30 сентября 2025 года

Закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 30 сентября 2025 г. | 30 сентября 2024 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 27 501 | 19 825 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 2 593 | 1 610 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 24 908 | 18 215 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 62 376 | 52 217 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 34 735 | 26 456 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 27 641 | 25 761 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 2 075 | 1 575 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 1459 | (154) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 72 287 | 69 977 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | - | 239 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 5 928 | 23 138 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 1 396 | 7 842 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 53 911 | 44 577 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 4 380 | 4 483 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 65 547 | 51 257 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 16 287 | 11 563 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 49 260 | 39 694 |

Председатель Правления Дубков С.В.

Главный бухгалтер Бельник А.Н.

Дата подписания: 7 октября 2025 г.

УНП 807000069

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК

## ОАО «БНБ-Банк»

пр-т Независимости, 173, 18-й этаж, 220114, г. Минск, Республика Беларусь

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
### 30 сентября 2025 года

Наименование банка: ОАО «БНБ-Банк»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 30.09.2025 | 01.01.2025 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 180 073 | 198 507 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 321 756 | 233 629 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 276 352 | 281 101 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 156 560 | 101 288 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 969 779 | 863 573 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 306 | 306 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 47 532 | 39 965 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 332 | 6 921 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 11 409 | 4 811 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 145 | 109 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 10 889 | 14 054 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 1 975 133 | 1 744 264 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 82 621 | 67 826 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 1 628 692 | 1 447 650 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 10 372 | 15 966 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 34 | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 22 341 | 18 961 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 1 744 060 | 1 550 403 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 27 688 | 27 688 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 90 588 | 88 479 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 10 611 | 11 534 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 102 186 | 66 160 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 231 073 | 193 861 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 1 975 133 | 1 744 264 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
### за 3 квартал 2025 года

Наименование банка: ОАО «БНБ-Банк»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 30.09.2025 | 30.09.2024 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 85 115 | 69 024 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 50 035 | 24 470 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 35 080 | 44 554 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 53 920 | 44 228 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 32 855 | 34 927 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 21 065 | 9 301 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (308) | (1) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 79 162 | 48 344 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 732 | 446 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 13 753 | 8 667 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 5 273 | 15 665 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 73 581 | 69 418 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 4 690 | 2 363 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 48 980 | 37 861 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 10 979 | 9 216 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 38 001 | 28 645 |

Председатель Правления Ю.М. Галков

Главный бухгалтер Г.П. Лаптёнок

Дата подписания: 01 октября 2025 года

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта БНБ-Банка: **https://www.bnb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь № 10 от 6 мая 2025 г. УНП 100513485.

# УСТОЙЛІВАЕ РАЗВІЦЦЁ ДЗЯРЖАВЫ І РАБОТА З МОЛАДДЗЮ

## Сем аспектаў электаральнага суверэнітэту



Фота БелТА.

Сем важных аспектаў дзейнасці для забеспячэння электаральнага суверэнітэту назваў старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Беларусі Ігар КАРПЕНКА падчас міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Фарміраванне прававой культуры насельніцтва як фактар гарманізацыі і ўстойлівасці выбарчага працэсу» ў рамках II Міжнароднага электаральнага форуму, які праходзіць у Мінску.

Тэматыка канферэнцыі, як і мерапрыемстваў форуму ў цэлым, абумоўлена пошукам адказаў на сучасныя выклікі і праблемы ў галіне забеспячэння электаральнага суверэнітэту. Тут старшыня ЦВК выдзеліў некалькі важных аспектаў дзейнасці.

Гаворачы аб першым аспекце — устойлівым сацыяльна-эканамічным развіцці дзяржавы, Ігар Карпенка адзначыў, што ва ўмовах жорсткай барацьбы за рынкі збыту і доступ да рэсурсаў змогуць выстаяць тыя дзяржавы, эканамічная мадэль якіх будзе ўстойлівай да сучасных выклікаў. Пры гэтым устойлівасць — такі стан сістэмы, пры якім магчыма процістаянне не толькі агрэсіўным уздзеяннем знешняга асяроддзя, але і ўнутраным неспрыяльным фактарам развіцця.

«На жаль, эканамічныя праблемы, якія ствараюцца ўсялякімі санкцыямі і гандлёвымі войнамі, аказваюць уздзеянне ў тым ліку на электаральны суверэнітэт, выкарыстоўваюцца ў якасці механізму дасягнення геапалітычных мэт асобнымі дзяржавамі. Значыць, у аснове ўмацавання дзяржаўнага суверэнітэту, падтрымання стабільнасці ў грамадстве, забеспячэння бяспекі і грамадскай згоды знаходзіцца моцная эканоміка і моцная сацыяльная палітыка, накіраваная на павышэнне дабрабыту народа», — сказаў старшыня ЦВК.

Другі аспект — рэалізацыя дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, якая нацэлена на перадачу вопыту папярэдніх пакаленняў, стварэнне ўмоў для самарэалізацыі і раскрыцця патэнцыялу моладзі ў інтарэсах грамадства і дзяржавы. «Вельмі важна паказваць маладым людзям значнасць іх удзелу ў кіраванні дзяржавай, тлумачыць, з якой мэтай праводзяцца выбары і чаму кожны грамадзянін павінен рэалізоўваць свае выбарчыя правы, — упэўнены кіраўнік ЦВК. — Пераадоленне абсэнтэісцкіх поглядаў, праяў нігілізму сярод моладзі патрабуюць распрацоўкі комплексных мер, накіраваных на фарміраванне пазітыўнага светапогляду і прыцягненне да актыўнага грамадзянскага ўдзелу».

Паводле слоў Ігара Карпенкі, невыпадкова ў праграме электаральнага форуму і канферэнцыі чырвонай ніццю праходзіць маладзёжная тэматыка. Дыскусіі, сустрэчы, дыялогавыя пляцоўкі, клубы маладых выбаршчыкаў, дзейнасць маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў і фарміраванняў — усё гэта накіравана на развіццё метадаў работы ў маладзёжным асяроддзі, у аснове якіх закладзены прынцып «роўны навучае роўнага».

Трэці аспект — інфармацыйныя тэхналогіі. Так, пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў значную ролю адыгрываюць інфармацыйныя стратэгіі. Стварэнне эфектыўных каналаў камунікацыі і паляпшэнне медыйнай дасведчанасці насельніцтва дасць магчымасць фарміраваць усвядомленую грамадска-палітычную думку, здольнасць насельніцтва крытычна ставіцца да знешніх інфармацыйных уздзеянняў.

Старшыня ЦВК указаў, што сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі дасягнулі такога ўзроўню, што па зададзеных чалавекам крытэрыях аўтаматычныя сістэмы здольны генерыраваць і размяшчаць у сетцы не толькі тэкст, але і аўдыявізуальныя матэрыялы, якія нельга адрозніць ад рэальных. Пры гэтым хуткасць такога распаўсюджвання робіць практычна немагчымым барацьбу з фэйкамі традыцыйнымі сродкамі. Невыпадкова Прэзідэнт Беларусі неаднаразова выказваў занепакоенасць наконт перспектыў бескантрольнага выкарыстання магчымасцяў штучнага інтэлекту.

Сусветныя дзяржавы сінхронна перагледзелі стратэгіі развіцця штучнага інтэлекту. Расія, Кітай, ЗША і Еўропа сыходзяцца на думцы, што штучны інтэлект у найбліжэйшай будучыні стане базавай тэхналогіяй, якая вызначае становішча дзяржавы на сусветнай арэне. «Таму прамаруджванне ў гэтай гонцы недапушчальна як у цэлым, так і ў электаральнай сферы ў прыватнасці. У сувязі з гэтым вывучэнне ШІ і ўкараненне інфармацыйных тэхналогій у кантэксце забеспячэння электаральнага суверэнітэту бачыцца актуальнай задачай для арганізатараў выбараў», — лічыць Ігар Карпенка.

Прадаўжаючы тэму, у якасці чацвёртага аспекта старшыня ЦВК назваў кансалідацыю палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. У сувязі з гэтым, лічыць ён, канструктыўны грамадскі рух можа і павінен удзельнічаць у распаўсюджванні ведаў аб выбарчай сістэме і асноўных этапах выбарчага працэсу. Такое супрацоўніцтва з арганізатарамі выбараў дасць магчымасць распрацоўваць сумесныя адукацыйныя праграмы, рэалізоўваць сацыяльна значныя праекты і мерапрыемствы, якія дапамогуць людзям усвядоміць значнасць іх удзелу ў выбарах.

«Такім чынам, аб'яднанне практычнага вопыту і ведаў, рэсурсаў і намаганняў пры эфектыўнай каардынацыі дзеянняў прывядзе ўдзельнікаў грамадскага руху да ўзмацнення свайго палітычнага ўплыву, павышэння электаральнай культуры насельніцтва. А значыць, пасадзейнічае ўмацаванню электаральнага суверэнітэту», — сказаў Ігар Карпенка.

Акрамя таго, найважнейшымі аспектамі з'яўляюцца навучанне і падрыхтоўка суб'ектаў выбарчага працэсу, актывізацыя экспертнай супольнасці, міжнароднае супрацоўніцтва, дадаў старшыня ЦВК.

**Як развіццё сістэмы міжнароднага назірання за выбарамі ўплывае на развіццё прававой культуры грамадства, расказаў на канферэнцыі першы намеснік Генеральнага сакратара СНД Ігар ПЕТРЫШЭНКА.**

«Прававая культура грамадства адыгрывае вельмі значную, калі не вызначальную ролю ў правядзенні сумленных і справядлівых выбараў. Не закранаючы ўсе фактары, якія ўплываюць на ўзровень прававой культуры выбаршчыкаў, засяроджу ўвагу на тых, якія наўпрост уздзейнічаюць на безумоўнае прыняцце грамадствам вынікаў выбараў, што садзейнічае стабільнасці палітычнай сістэмы. У гэтым плане адным з важных фактараў фарміравання прававой культуры выбаршчыкаў з'яўляецца выкананне прынцыпу адкрытага і галоснага характару выбараў. Ён мае на ўвазе ўсебаковае інфармаванне грамадзян пра ўсе складнікі выбарчага працэсу, у тым ліку дзейнасць арганізатараў выбараў, звесткі аб кандыдатах, магчымасць азнаямлення з іх праграмамі і гэтак далей, аж да парадку галасавання і падвядзення вынікаў выбараў. Даванне такой інфармацыі дазваляе выбаршчыкам усебакова ацаніць ход электаральнай кампаніі і зрабіць усвядомленую выснову аб справядлівасці праведзеных выбараў».

Першы намеснік генеральнага сакратара СНД дадаў, што яшчэ адным пацвярджэннем сумленнасці выбараў з'яўляецца грамадскае і міжнароднае назіранне за іх правядзеннем. «Незалежная ацэнка выбарчай кампаніі, якую даюць міжнародныя наглядальнікі, успрымаецца выбаршчыкамі як вердыкт, які пацвярджае выкананне закона на ўсіх этапах электаральнага працэсу», — сказаў Ігар Петрышэнка.

**Паводле БелТА.**

# ЗАРПЛАТНЫ СТЫМУЛ

## Рост даходаў стратэгічна павінен адбівацца на прадукцыйнасці працы

Рост даходаў насельніцтва ў цэлым і заработнай платы ў прыватнасці — вельмі пазітыўны фактар для грамадзян. Вядома, не ў грошах шчасце, але рост дабрабыту радуе кожнага. З іншага боку, такі паказчык з'яўляецца праінфляцыйным: вытворцам даводзіцца падымаць цэны, каб стымуляваць сваіх работнікаў. Гэты трэнд нядаўна адзначыў і Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын. Пра ціск на інфляцыю росту заробкаў неаднаразова згадвалі ў сваіх справаздачах і эксперты Еўразійскага банка развіцця (ЕАБР). Тэзіс справядлівы, але ў моманце. З тактычнага і стратэгічнага пункту гледжання рост заробкаў можа з'яўляцца адным са стымулаў і фактараў для выхаду эканомікі на новы якасны ўзровень з павышэннем і эфектыўнасці, і прадукцыйнасці працы. І на гэты трэк наша эканоміка выкіроўвае, пра што сведчаць высокія паказчыкі дынамікі інвестыцый. У тым ліку за восем месяцаў на 20,2 % выраслі выдаткі на закупку машын, абсталявання і транспартных сродкаў. Стратэгічная задача ўрада выразна ў гэтым годзе пазначаная: рост эканомікі праз запуск інвестыцыйнага цыкла і выхад на новы ўзровень эфектыўнасці.



Інвестыцыйны цыкл — гэта не толькі замена абсталявання, машын, рабатызацыя і аўтаматызацыя, устаноўка новага праграмнага забеспячэння. Нават самае сучаснае і дасканалае жалеза без інтэлектуальнага напаўнення чалавечым капіталам не прыносіць фінансава-эканамічнага выніку. Мадэрнізацыя — гэта не толькі пра замену асноўных фондаў, але і пра павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў, кіраўнікоў, выбудоўванне новых бізнес-працэсаў. І ў цэлым пераход на новую філасофію вытворчасці. Гэта патрабуе супрацоўнікаў новай кваліфікацыі. І, адпаведна, узровень заработнай платы ў іх павінен быць вышэй.

Што першасна: прадукцыйнасць або рост заработнай платы — бясконцы дыскурс. Грошы павінны быць зароблены. Тэзіс, які складана абвергнуць. З іншага боку, інвестыцыйны цыкл не з'яўляецца лінейным з пункту гледжання вытворчых і фінансава-эканамічных вынікаў. Патрабуецца пэўны часовы прамежак для выхаду мадэрнізаванай вытворчасці на праектную магутнасць. Часам на гэта сыходзіць некалькі тыдняў, часам — некалькі месяцаў, а то і гадоў. Залежыць ад галіны. Скажам, тыя ж аўтакампаненты патрабуюць сертыфікацыі, якая доўжыцца некалькі месяцаў. Але кваліфікаваны персанал патрэбны са старту праекта. І людзей неабходна стымуляваць альбо павышаць кваліфікацыю, альбо завабліваць новых вопытных работнікаў. І заработная плата — адзін з важных крытэрыяў стымулявання. Яго ігнараваць немагчыма. Але максімальная эфектыўнасць ад новай вытворчасці наступіць толькі праз некаторы час. Таму з'яўляецца цалкам нармальным, калі даходы работнікаў на нейкім этапе інвестыцыйнага цыкла апярэджваюць і прадукцыйнасць працы, і дынаміку вытворчых і фінансава-эканамічных паказчыкаў прадпрыемства.

Іншае пытанне, што ўсе гэтыя нюансы павінны ўлічвацца ў бізнес-планах. І рост заробкаў павінен быць абгрунтаваны. Калі не ў моманце, то ў будучыні, рамкі якой дакладна вызначаны. Трэба разумець, што чалавечы капітал сёння набывае ўсё больш дамінуючае значэнне ў эканоміцы. І цалкам справядліва, каб укладанні ў яго ўлічваліся ў інвестыцыйных праграмах, у тым ліку і з пазіцыі матэрыяльнага стымулявання на ўсіх этапах інвестыцыйнага цыкла.

Як мне бачыцца, рост заработнай платы сам па сабе не можа з'яўляцца праблемай. Яе дынаміку неабходна разглядаць праз прызму прычынна-выніковых сувязяў і ў моманце, і ў сярэдне- і доўгатэрміновым перыядзе. Павінна праглядацца павышэнне і прадукцыйнасці працы, і эфектыўнасці ў будучыні. І ў гэтым выпадку рост даходаў цалкам апраўданы. Яго можна разглядаць як інвестыцыі ў будучыню. Іншае пытанне, што ўсе інвестыцыі павінны прыносіць пэўны прыбытак. А гэта ўжо пытанне якасці бізнес-планавання.

Пра гэта нядаўна гаварыў і першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Аляксандр Ягораў. Праўда, ён сканцэнтраваўся на праблемных прадпрыемствах. Але тэзіс, у прынцыпе, справядлівы для ўсіх прадстаўнікоў рэальнага сектара. Аляксандр Ягораў адзначыў: аздараўленне праблемных вытворчасцяў і галін павінна рабіцца не толькі праз упырскванне грошай і рэструктурызацыю запазычанасці. Павінна мяняцца стратэгія кампаніі, каб выходзіць на нармальную працу. Калі эфектыўна атрымоўваецца ўпісацца ў рынак, то будзе і прадукцыйнасць працы, і эканамічная эфектыўнасць. Таму рост заробкаў я разглядаў бы не толькі праз праблему дэфіцыту работнікаў, але і праз якасць планавання — і карпаратыўнага, і галіновага. А гэтай праблематыкай і ўрад, і Нацыянальны банк займаюцца самым сур'ёзным чынам.

**Аляксей КЛІМАЎ.**








# ДРАЙВЕР РОСТУ

## ЕАБР: патэнцыял прыросту экспарту ў прамысловасці Беларусі складае звыш $5 млрд

Такія даныя ўтрымліваюцца ў даследаванні Еўразійскага банка развіцця «Патэнцыял развіцця прамысловасці высокіх перадзелаў у Еўразійскім рэгіёне». Аб яго ключавых высновах — у нашым матэрыяле.

### Беларусь займае 56 месца ў сусветным рэйтынгу

У прыватнасці, у даследаванні адзначаецца, што прамысловасць Еўразійскага рэгіёна (у які ўваходзяць Арменія, Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Расія, Таджыкістан, Узбекістан) уяўляе сабой найбуйнейшы сектар эканомікі, фарміруючы каля 31 % сукупнага ВУП рэгіёна, што эквівалентна 834 мільярдам долараў па стане на 2024 год. Унутры гэтага сектара ключавая роля належыць апрацоўчай прамысловасці, якая генерыруе 44,2 % валавой дабаўленай вартасці прамысловасці, або каля 368 мільярдаў долараў (13,6 % рэгіянальнага ВУП). На глабальным узроўні апрацоўчая прамысловасць Еўразійскага рэгіёна забяспечвае 2,2 % сусветнай дабаўленай вартасці ў сектары. Гэта суадносіцца з доляй рэгіёна ў глабальным ВУП (2,4 % у 2024 годзе).

У даследаванні адзначаецца, што прамысловасць рэгіёна адрозніваецца недастатковым узроўнем і неаднастайнасцю тэхналагічнай складанасці. Найбольш індустрыяльна развітыя дзяржавы — Расія і Беларусь — маюць параўнальна высокую долю прадукцыі сярэдніх і высокіх перадзелаў (Расія займае 33-е месца ў свеце па індэксе прамысловай канкурэнтаздольнасці, **Беларусь — 56-е**). У той жа час менш буйныя эканомікі, такія як Кыргызстан (115-е месца) і Таджыкістан (121-е), практычна не вырабляюць прадукцыю высокіх перадзелаў, дэманструючы ўразлівасць сваіх прамсектараў.

Паводле даных даследавання, агульнымі праблемамі для большасці краін застаюцца нізкая доля высокатэхналагічнай прадукцыі ў структуры выпуску і экспарту і недастатковая дыверсіфікацыя экспарту. У экспартных пастаўках па-ранейшаму пераважаюць тавары нізкай ступені перапрацоўкі (першая стадыя перадзелу) з нізкай дабаўленай вартасцю — паўфабрыкаты металургіі, базавай хіміі, нафтапрадукты і іншыя. Разам яны фарміруюць аснову знешняга гандлю рэгіёна, што ўтрымлівае яго на перыферыі сусветнай прамысловай экспансіі.

— Выключэнне складаюць асобныя выпадкі: напрыклад, у Арменіі і Беларусі значную частку экспарту ўжо складаюць тавары больш высокай перапрацоўкі — гэтаму спрыяе доступ на ёмісты расійскі рынак, — звяртаюць увагу аўтары дакумента.

На думку аналітыкаў ЕАБР, структурныя праблемы бягучай мадэлі развіцця могуць быць пераадолены шляхам дыверсіфікацыі вытворчасці і экспарту, пры якой фокус будзе зрушаны ў бок прадукцыі больш высокіх перадзелаў.

### Як знізіць эканамічную ўразлівасць рэгіёна?

Спецыялісты адзначаюць, што сёння прамысловы патэнцыял Еўразійскага рэгіёна дазваляе разлічваць на значнае павелічэнне экспарту. Яго штогадовы прырост можа скласці **больш за 70 мільярдаў долараў за год**. Што датычыцца Беларусі, аналітыкі прагназуюць яго павелічэнне да 16 %.

Патэнцыял імпартазамяшчэння Еўразійскага рэгіёна супастаўны па маштабах з экспартным і складае 81 мільярд долараў у год. Патэнцыял замяшчэння імпарту ацэньваецца ў нашай краіне ў аб'ёме **5,1 мільярда долараў**, а доля замешчанага імпарту — у 13 %.

Найбольшыя перспектывы ў сферах аўтамабілебудавання, хімічнай прамысловасці, у вытворчасці машын і абсталявання, металаў, харчовых прадуктаў, электрычнага абсталявання, камп'ютараў, тэкстылю, гумовых і пластмасавых вырабаў, гатовых металічных вырабаў, акрамя машын.

— У выпадку поўнай рэалізацыі патэнцыялу імпартазамяшчэння ў шэрагу краін і галін доля прадукцыі другой стадыі перадзелу ў імпарце знізіцца, але ў цэлым застанецца ўмерана высокай, асабліва ў машынабудаванні, — адзначаюць аналітыкі.

Дарэчы, імпартазамяшчэнне разглядаецца не ў ізаляцыяніcцкім ключы, а як механізм зніжэння эканамічнай уразлівасці рэгіёна, павышэння тэхналагічнай устойлівасці і адаптацыі да ўмоў знешняга ціску. Асабліва важна, што яго рэалізацыя спалучаная з магчымасцямі тэхналагічнай мабілізацыі і індустрыяльнага абнаўлення.

— У канчатковым выніку сукупны эфект прыросту экспарту, імпартазамяшчэння і павелічэння выпуску пасля рэалізацыі патэнцыялу развіцця прамысловасці высокіх перадзелаў у Еўразійскім рэгіёне перавысіць **510 мільярдаў долараў за год** (у цэнах базавага 2019 года), прычым 70 % гэтага эфекту будзе сфарміравана ўскоснымі і індуцыраванымі эфектамі павелічэння выпуску, — адзначаецца ў даследаванні. — Астатні эфект прыкладна ў роўнай ступені размеркаваны паміж нарошчваннем экспарту і замяшчэннем імпарту. Эфект інтэрпрэтуецца як штогадовы дадатковы аб'ём выпуску прадукцыі, якая ідзе на экспарт і на ўнутраны рынак (у выніку замяшчэння імпарту), і забеспячэнне першаснага імпульсу попыту (у форме ўскосных і індуцыраваных эфектаў).

Ускосныя макраэфекты ў нашай краіне, на думку аналітыкаў, могуць скласці 9,65 мільярда долараў, а агульны эфект — 19,73 мільярда долараў.

### ЗНАЧЭННЕ АПРАЦОЎЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ Ў КРАІНАХ ЕЎРАЗІЙСКАГА РЭГІЁНА, 2024 ГОД




### АЦЭНКА ПАТЭНЦЫЯЛУ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСІ




(Крыніца: ацэнкі ЕАБР па даных ААН у адпаведнасці з метадалогіяй у цэнах 2019 г.)

# ПРАВІЛЫ БАРШЧОВАГА НАБОРУ

## Дзяржава загадзя вызначыла цэнавыя правілы гульні на агароднінным рынку ў міжсезонны перыяд

**Узімку бульба будзе па рублі за кілаграм. Дакладней, крыху даражэй — 1 рубель 7 капеек. Такі цэнавы парог устанавіла для нацыянальнага караняплода Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю. Прынамсі, для агародніны, якая будзе паступаць у рамках дзяржаўнага заказу. Мне як спажыўцу пазначаная рамка нават вельмі імпануе. Мяркую, што мяжа можа збянтэжыць фермераў і вытворцаў. Магчыма, не цяпер, а пазней. Цяпер пік збору свежага ўраджаю. І прапанова разнастайная, шырокая і шматгранная: як па спажывецкіх характарыстыках восеньскай агародніны, так і па яе цане. У міжсезонны перыяд сітуацыя некалькі мяняецца. Але, забягаючы наперад, канстатую: удзел у дзяржаўным заказе — справа добраахвотная. Магчыма, рубель з хвастом за кілаграм прадукту — невысокая цана. Але ёсць жа і іншы важны фактар: гарантаваны збыт, па-першае. Па-другое, калі не ўсё, то значная частка стратэгічных запасаў агародніны на зіму фарміруецца па перадаплаце.**

Нагадаю адзін з фінансава-эканамічных законаў: чым вышэйшая рызыка камерцыйнай дзейнасці, тым больш значная выгада. Пры ўмове што спрыяльныя абставіны пераважаць форс-мажоры рознага фармату. Увогуле, вытворчасць агародніны — вельмі рызыкоўны бізнес. І справа не толькі ва ўмовах надвор'я. Існуе яшчэ мноства эканамічных невядомых.

Бульбяны ажыятаж сёлетняй вясной непрыемны для спажыўца (зорны для вытворцаў), але гэта толькі невялікі фрагмент рынкавай гісторыі. Хутчэй выпадковасць, чым заканамернасць. І як складуцца попыт і прапановы ў гэтым годзе — пытанне нават вельмі цікавае. Як мінімум ёсць адна вялікая, нават велізарная, невядомая: паводзіны хатніх гаспадарак. Нагадаю: каля 60 тысяч гектараў у Беларусі занята пад садовыя таварыствы. Ураджай з гэтых угоддзяў, можна сказаць, не ўлічваецца ў прадуктовых балансах. Прычым на сваіх загарадных фазэндах бавіць вольны час каля 5 мільёнаў беларусаў. Дадайце яшчэ 2 мільёны сельскіх жыхароў. А яшчэ існуе прыватны сектар у райцэнтрах: у некаторых — вельмі шырокі. Іншымі словамі, амаль кожны беларус, нават глыбокагарадскі жыхар, валодае доступам да зямлі. Цяпер пытанне: як спажывец зрэагаваў на вясновую агароднінную сітуацыю? Мяркуючы па тым, як паўгода таму хвацка разыходзіўся ў гандлёвых пунктах пасяўны матэрыял, нямала грамадзян успрынялі заклік Прэзідэнта пасадзіць некалькі радкоў бульбы. І ў цэлым дрэнна ці не, але ў нейкай ступені сябе забяспечылі. Нельга выключаць, што нават на ўсю зіму: у падвалах і гаражах агародніна захоўваецца досыць нядрэнна, калі яе папярэдне добра перабраць.

Хачу нагадаць: у сярэднім беларус купляе за год 55—60 кілаграмаў бульбы. Пры нармальнай ураджайнасці каля 400 цэнтнераў з гектара для задавальнення такіх патрэб трэба ўсяго 0,15 соткі зямлі. Груба кажучы: невялікі закутак у агародзе здольны забяспечыць сям'ю бульбай на цэлы год. Вытворчая дзейнасць хатніх гаспадарак для ўласных патрэб у некаторых сегментах рынку з'яўляецца магутным фактарам і пакуль не ўлічваецца і слаба пралічваецца. Таму ці будзе такі высокі попыт, як летась? Складанае пытанне. Не выключана, што рознічныя продажы той жа бульбы могуць паказаць адмоўную дынаміку. І гэта на фоне нядрэннага ўраджаю, які ацэньваецца ў 3,5 мільёна тон (сельскагаспадарчыя арганізацыі, фермеры і асабістыя падсобныя гаспадаркі).

Прывабнасць дзяржаўнага заказу — гарантаваны збыт па зразумелай цане. Так, яна можа быць ніжэйшай за ўмоўна рынкавую, а можа быць вышэйшай. Але гэта будзе ўжо зразумела потым. Першыя здагадкі з'явяцца дзе-небудзь у снежні-студзені. А дакладнае разуменне прыйдзе ў лютым-сакавіку. Не буду спрачацца: дзяржзаказ не дае шмат зарабіць, бо вырашае ў першую чаргу сацыяльную задачу забеспячэння насельніцтва вітамінавай прадукцыяй. Натуральна, закладваецца станоўчая рэнтабельнасць вытворцаў і пастаўшчыкоў. Але яна далёкая ад фантастычнай або таго прыбытку, які можна патэнцыяльна атрымаць пры занадта спрыяльнай кан'юнктуры, як гэта было летась на тым жа расійскім рынку. Затое і рызыка атрымаць страты нашмат ніжэйшая, калі працаваць па папярэднім заказе. Таксама хочацца адзначыць: запасы на зіму пад эгідай дзяржавы фарміруюцца, як правіла, па перадаплаце. Некаторыя дагаворы заключаюцца з фермерамі яшчэ ранняй вясной, на самым пачатку сяўбы. У гэтым выпадку вытворцы не трэба прыцягваць абаротныя рэсурсы. Адпаведна, калі яны пазыковыя — плаціць працэнт, калі ўласныя — можна іх размясціць на дэпазітах і атрымаць дадатковы прыбытак. Гэты нюанс неабходна таксама ўлічваць.

У гэтым разрэзе і трэба ацэньваць устаноўленыя гранічныя цэны. Дарэчы, апытанне ўдзельнікаў рынку паказала: цяпер на опце фермеры і з асабістых падсобных гаспадарак бульбу прадаюць максімум па 50—60 капеек. Нярэдка — танней. І ёсць канкурэнцыя. Гарантаваны збыт у міжсезонны перыяд па фіксаваных цэнах выглядае не так ужо і нецікава. Іншая справа: павінны вытрымлівацца ўмовы захоўвання, каб мінімізаваць страты.

**Аляксей КЛІМАЎ.**









# НАЦБАНК ЗМЯНЯЕ ПАРАДАК ВЫДАЧЫ КРЭДЫТАЎ




З 22 лістапада ў Беларусі ўступаюць у дзеянне змяненні ў інструкцыю аб парадку прадастаўлення грашовых сродкаў у форме крэдыту і іх вяртання (пагашэння). Адпаведнае рашэнне прынята пастановай праўлення Нацбанка.

Галоўным чынам у інструкцыі прапісана ўмова прадастаўлення кліенту дадатковага часу, за які спажывец канчаткова вырашыць — браць яму крэдыт ці не. У прэс-службе Нацыянальнага банка нам патлумачылі, што з улікам станоўчага вопыту прымянення банкамі на практыцы рэкамендацый, накіраваных на папярэджанне ашуканскіх дзеянняў, у інструкцыі ўведзена патрабаванне заключэння крэдытнага дагавора не раней працоўнага дня, які ідзе за днём звароту па атрыманне крэдыту, ці прадастаўлення крэдыту не раней працоўнага дня, які ідзе за днём заключэння крэдытнага дагавора.

Але існуе пэўнае выключэнне. Гэта патрабаванне не распаўсюджваецца на выпадкі, калі грашовыя сродкі пералічваюцца банкам на аплату тавараў або паслуг, для набыцця якіх прадастаўляецца крэдыт. У ліку змяненняў у інструкцыі — абавязак банкаў у выпадку аналізу крэдытнай справаздачы заяўніка прымаць рашэнне аб магчымасці прадастаўлення крэдыту з улікам колькасці запытаў яго крэдытнай гісторыі за апошнія сем каляндарных дзён. Таксама замацаваны абавязак банкаў да заключэння крэдытнага дагавора інфармаваць грамадзян пад подпіс аб формах і метадах махлярства з боку трэціх асоб. Акрамя таго, зыходзячы з банкаўскай практыкі, уводзіцца тэрмін «інвестыцыйны крэдыт» і вызначаюцца яго крытэрыі.

Змены ў інструкцыю ўступаюць у сілу і будуць спрыяць павышэнню якасці прадастаўлення банкаўскіх паслуг, даступнасці крэдытаў, а таксама ўзроўню абароны правоў спажыўцоў фінансавых паслуг, лічаць у Нацбанку.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «Я ХАЧУ ПРЫВЕЗЦІ Ў БЕЛАРУСЬ СВАЮ СЯМ'Ю, БО ТУТ БЯСПЕЧНА!»

## Інфармацыя, распаўсюджаная шэрагам інтэрнэт-рэсурсаў аб грамадзяніне Афганістана, не адпавядае рэчаіснасці



У некаторых крыніцах на прасторах інтэрнэту распаўсюдзілася інфармацыя аб грамадзяніне Афганістана, які спрабаваў нелегальна трапіць у Еўрасаюз праз Беларусь і страціў руку нібыта з-за жорсткага абыходжання з ім беларускімі міліцыянерамі. Тое, што гэта фэйк, пацвердзілі і супрацоўнікі органаў унутраных спраў, і ўрачы, і сам мігрант.



Як адзначыў **начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Беларусі Іван НОВІКАЎ**, грамадзянін Афганістана Джыхад Махамад Гуль прыбыў у Рэспубліку Беларусь з Расійскай Федэрацыі і 30 чэрвеня быў затрыманы ў Мінску з групай нелегальных мігрантаў. «На той момант у замежнага грамадзяніна скончыўся тэрмін дзеяння расійскай візы, якая давала яму права знаходжання ў нашай краіне, — удакладніў ён. — У сувязі з гэтым у адносінах да парушальніка было прынята рашэнне аб добраахвотнай дэпартацыі: 1 ліпеня ён выехаў у Расію».

Аднак мужчына незаконна вярнуўся ў Беларусь і 27 ліпеня звярнуўся ў сталічную ўстанову аховы здароўя па медыцынскую дапамогу. Пасля аказання меддапамогі быў адпушчаны, але праз два дні яго шпіталізавалі: на лячэнні ў бальніцы грамадзянін Афганістана знаходзіўся да 20 верасня.



Як паведаміла **галоўны ўрач Бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Вольга СВЯТЛІЦКАЯ**, грамадзянін Афганістана, аб якім ідзе размова, быў дастаўлены ў гэту клініку брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі ў прытомнасці. «Аднак кантакт з ім не ладзіўся, паколькі гэты грамадзянін абсалютна не валодаў рускай мовай і вельмі дрэнна размаўляў на англійскай мове (ведаў усяго некаторыя словы), — удакладніла яна. — Улічваючы тое, што ён быў узяты на вуліцы і дастаўлены брыгадай хуткай дапамогі, мы правядзілі комплекснае абследаванне згодна з нашым пратаколам».

Кажучы аб стане здароўя пацыента, калі ён першы раз паступіў у бальніцу, галоўны ўрач расказала, што ў яго была істотна траўміравана рука — назіраліся паверхневыя пашкоджанні ў выглядзе ран мяккіх тканак правай кісці і правага перадплечча з прыкметамі інфіцыравання. «Грамадзянін не тлумачыў абставіны і тэрміны атрымання траўмы, — заўважыла Вольга Святліцкая. — Нашы супрацоўнікі прапанавалі яму шпіталізацыю, але грамадзянін паводзіў сябе негатыўна, ад шпіталізацыі адмовіўся і пакінуў наша аддзяленне».

Аднак ва ўстанову аховы здароўя брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі ён быў дастаўлены паўторна. «Пры гэтым назіралася сур'ёзнае пагаршэнне стану, — канстатавала Вольга Святліцкая. — Прыкметы запалення хутка нараслі, з'явіліся прыкметы флегмоны (вострага гнойнага запалення мяккіх тканак. — **«Зв.»**), таму быў кансіліум. Грамадзяніну на англійскай мове (ён быў у прытомнасці, усё разумеў) было патлумачана, што калі рука не будзе ампутавана, то высокая верагоднасць смяротнага зыходу ў найбліжэйшыя суткі-двое ад інтаксікацыі».



Скрыншоты з відэа МУС.

У выніку грамадзяніну Афганістана была зроблена аперацыя, у шпіталі ён правеў 52 дні. Беларускія медыкі зрабілі ўсё магчымае для захавання жыцця замежнага грамадзяніна. Выдаткі дзяржбюджэту на яго лячэнне перавысілі 56 тысяч рублёў і да гэтага часу не кампенсаваны.

«9 верасня ў Дэпартамент па грамадзянстве і міграцыі МУС з Прадстаўніцтва ўпраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў паступіў ліст, у якім паведамлялася аб тым, што ўказаны грамадзянін Афганістана хоча звярнуцца з хадайніцтвам аб прадастаўленні статусу бежанца, дадатковай абароны або прытулку ў Рэспубліцы Беларусь, — праінфармаваў Іван Новікаў. — Таксама паведамлялася аб тым, што ён знаходзіцца ў бальніцы з ампутаванай рукой».

22 верасня Дэпартаментам па грамадзянстве і міграцыі МУС Беларусі дадзены адказ, што пасля завяршэння лячэння іншаземцу неабходна асабіста звярнуцца з хадайніцтвам аб абароне ва ўпраўленне па грамадзянстве і міграцыі УУС Віцебскага аблвыканкама. Таксама яму даецца магчымасць размяшчэння ў пункце часовага пасялення бежанцаў у абласным цэнтры.

8 кастрычніка грамадзянін Афганістана прыбыў у Віцебск для падачы хадайніцтва аб абароне. Органамі ўнутраных спраў іншаземцу аказваецца ўся неабходная дапамога і садзейнічанне.

Як паведаміў Джыхад Махамад Гуль, фізічная сіла з боку беларускіх міліцыянераў да яго не ўжывалася. «Я хачу прывезці ў Беларусь сваю сям'ю, бо тут бяспечна!» — сказаў ён і падзякаваў беларусам, якія аказалі яму дапамогу і працягваюць гэта рабіць.

**Вераніка КАНЮТА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор аукциона:** ООО «САНЗУРА», Минская область, Молодечненский р-н, г. п. Чисть, ул. Заводская, д. 3/1, комната 1-24

**Оператор:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by

**Продавец:** ОАО «Опытный завод металлоконструкций», 220073, г. Минск, пр-т Пушкина, 68

**Предмет электронных торгов: имущество (бывшее в употреблении), расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Пушкина, 68**

**Перечень 1 (снижение начальной стоимости на 80 %)**

| Лот № | Наименование | Инв. номер | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1. | Выпрямитель для дуговой сварки ВДУ 1250 УЗ | 386.2 | 3 312,00 |
| 2. | Выпрямитель для дуговой сварки ВДУ-506С УЗ | 384.2 | 312,00 |
| 3. | Полуавтомат для дуговой сварки ПДГО-510сВДУ-506 | 419.1 | 816,00 |
| 4. | Полуавтомат для дуговой сварки ПДГО-510сВДУ-506 | 418.1 | 816,00 |
| 5. | Полуавтомат сварочный Powertekc 355C | 488.1 | 1 728,00 |
| 6. | Полуавтомат сварочный ПДГ-508М-1 | 405.4 | 120,00 |
| 7. | Полуавтомат сварочный с аксессуарами NB-500 | 405.5 | 744,00 |
| 8. | Сварочный выпрямитель ВД-301 | 118.4 | 84,00 |
| 9. | Сварочный выпрямитель ВДУ-504 | 137.4 | 240,00 |
| 10. | Сварочный полуавтомат WEGA 500 MIG | 390.4 | 648,00 |
| 11. | Сварочный аппарат Origo Mig 510w | 459.1 | 2 112,00 |
| 12. | Сварочный аппарат Origo Mig 510w | 460.1 | 2 112,00 |
| 13. | Сварочный выпрямитель KITin 190 | 382.2 | 211,20 |
| 14. | Сварочный п/автомат ESAB Mig 505 | 387.5 | 816,00 |
| 15. | Сварочный п/автомат ESAB Mig 505 | 386.5 | 816,00 |
| 16. | Сварочный п/автомат FASTMIG KM 500 | 380.4 | 1 152,00 |
| 17. | Сварочный п/автомат Jackle Mig-326G | 338.1 | 984,00 |
| 18. | Сварочный п/автомат KEMPI (в комплекте) | 375.4 | 1 560,00 |
| 19. | Сварочный п/автомат KIT 500S--И.Ф. | 361.4 | 888,00 |
| 20. | Сварочный п/автомат Origo Mig 510 | 381.4 | 1 728,00 |
| 21. | Сварочный п/автомат Origo Mig 510 | 358.4 | 1 728,00 |
| 22. | Сварочный п/автомат Origo Mig 510 | 350.4 | 1 728,00 |
| 23. | Сварочный п/автомат Origo Mig 510 | 351.4 | 1 728,00 |
| 24. | Сварочный п/автомат ПДГ-503.4 | 388.4 | 456,00 |
| 25. | Сварочный п/автомат ПДГ-504 | 400.4 | 456,00 |
| 26. | Сварочный п/автомат ПДГ-504 | 777.2 | 552,00 |
| 27. | Сварочный п/автомат ПДГ-504 | 777.1 | 552,00 |
| 28. | Сварочный полуавтомат ПДГ-504 | 567.1 | 552,00 |
| 29. | Устройство термопереплета UNIBIND XU 138 | 432.1 | 26,40 |

**Перечень 2 (снижение начальной стоимости на 80 %)**

| Лот № | Наименование | Инв. номер | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1. | Пневмоножницы 6210 B | 245.6 | 45,60 |
| 2. | Кантователь Flipper | 452.1 | 6 840,00 |
| 3. | Машина сушильная ЛС-8 | 231.6 | 230,40 |
| 4. | Окрасочный агрегат «Тритон» | 519.1 | 744,00 |
| 5. | Окрасочный агрегат «Тритон» | 481.1 | 504,00 |
| 6. | Сварочный трактор Miggytrac 1000 | 386.4 | 552,00 |
| 7. | Одношпиндельная сверлильная установка Ocean | 373.2 | 52 800,00 |

**Перечень 4 (снижение начальной стоимости на 60 %)**

| Лот № | Наименование | Инв. номер | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1. | Кран козловой УК-25/50 | 50.2 | 21840,00 |
| 2. | Сосуд № 1 ТРЖК-2у | - | 3504,00 |
| 3. | Сосуд № 2 ТРЖК-2у | - | 3504,00 |
| 4. | Сосуд № 3 ЦТК-1.6/0.25 | - | 2064,00 |
| 5. | Сосуд № 41 ТРЖК-7М | - | 1584,00 |
| 6. | Насос кислородный 22НСГ 63/20А (250/200) | 221.5 | 4368,00 |
| 7. | Насос кислородный 22НСГ 63/20А (250/200) | 222.5 | 4368,00 |
| 8. | Стол-плита 6М616Ф11-100-012/11--И.Ф. | 512 | 3360,00 |
| 9. | Стол-плита 7216-120-011/11--И.Ф. | 513 | 4944,00 |
| 10. | Стол станочный для сборки металлоконструкций | 118.5 | 4944,00 |
| 11. | Стол станочный для сборки металлоконструкций (2) | - | 3360,00 |

**Перечень 5 (снижение начальной стоимости на 50 %)**

| Лот № | Наименование | Инв. номер | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1. | Плоттер HP DesignLet T530 24-in Printer 5ZY60A, США | 524.1 | 594,00 |
| 2. | Ножницы листовые Н-483 | 83.3 | 15600,00 |
| 3. | Ножницы листов. Н-481А | 90.3 | 15360,00 |
| 4. | Кромкоскалывающий агрегат CHP 12G Испания | 369.2 | 4860,00 |
| 5. | Кран-укосина с тельфером г/п 1,0 т | 68.1 | 4080,00 |
| 6. | Магнитный укладчик | 127.7 | 2760,00 |
| 7. | Портативная газорезательная машина IMP РФ | 447.1 | 780,00 |
| 8. | Стол для сборки металлоконструкций 960*4000 (1) | - | 3480,00 |
| 9. | Стол для сборки металлоконструкций 960*4000 (4) | - | 3480,00 |
| 10. | Стол для сборки металлоконструкций 1100*4000 (1) | - | 4020,00 |
| 11. | Стол для сборки металлоконструкций 1400*6000 (1) | - | 7620,00 |
| 12. | Стол для сборки металлоконструкций 1400*6000 (2) | - | 7620,00 |
| 13. | Грузовой седельный тягач РЕНО ПРЕМИУМ, № кузова VF622GVA000131920, 2003 г. в. | 522.1 | 13680,00 |
| 14. | Безвоздушная электрическая окрасочная установка SPT490 200V 50 HZ R (Китай) | 528.1 | 474,00 |
| 15. | Маш. газорез. «Черномор2» | 7.5 | 14040,00 |
| 16. | Машина для резки мет. листов «Korsaras-7226» | 8.5 | 24480,00 |
| 17. | Машина термич. резки металла «Комета» (УКРАИНА) | 370.2 | 6840,00 |
| 18. | Порт. маш. с ЧПУ Vanad Are с комплектом обор. (Германия) | 372.2 | 31380,00 |
| 19. | Портальная машина плазменной резки (Чешская Республика) | 466.1 | 37080,00 |
| 20. | Сварочный трактор Miggytrac 1000 | 386.4 | 342,00 |
| 21. | Трактор Сварочный ТС-16-1 в комплекте со сварочным выпрямителем ВДУ-1250 РФ | 389.1 | 7800,00 |
| 22. | Трактор сварочный ТС-16-1 (типа АДФ-1002) РБ (УСС) | 420.1 | 1560,00 |
| 23. | Магнитоукладчик к УБР-25 | 121.7 | 2580,00 |

**Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 13.09.2025 г.**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 22.10.2025 г. с 10.00 до 11.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **21.10.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

**Перечень 6**

| Лот № | Наименование | Инв. номер | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1. | Рольганг приводной (комплект) | 1021.5 | 2 040,00 |
| 2. | Кран мостовой Q 10 тн, заводской номер 55598 | 142.1 | 63 000,00 |
| 3. | Кран мостовой Q 10 тн, заводской номер 55283 | 143.1 | 63 000,00 |

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **10.11.2025 г. с 10.00 до 11.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **06.11.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY13ALFA30122610040020270000 в BYN в ЗАО «Альфа-Банк», БИК: ALFABY2X, получатель платежа – ООО «ИСКУССТВО УПРАВЛЕНИЯ», УНП 193384519

**Контактное лицо по осмотру предмета электронных торгов и наличию обременений:** Дмитрий Александрович, тел. +375293180535

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: 5** (пять) рабочих дней после подписания договора

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **от 8-10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия.

| Контактные данные | Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by |
|---|---|

Индустрия Инноваций
юридическая компания
· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.b | |
| **Продавец** | ОАО «Агронёманский», УНП 600014486, 222961, Минская обл., Столбцовский р-н, с/с Новосверженский, аг. Старый Свержень, ул. Комарова, д. 1 | |
| **Вторые повторные публичные торги в форме электронного аукциона. Ранее опубликованное извещение о проведении аукциона опубликовано 17.09.2025 в газете «Звязда» № 179 (30567), стр. 13** | | |
| **Предмет электронного аукциона** | | |
| **№** | **Наименование (назначение), адрес** | **Начальная ена, бел. руб. с учетом НДС 20 %** |
| **1** | Погрузчик «Амкодор-332С-01», рег. знак ОВ-5 0334, местонахождение: Минская обл., Столбцовский р-н, д. Скоморошки, территория МТП | 21 780,00 |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронного аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»** | | |
| **Шаг электронного аукциона**– 5 % от начальной цены лота | | |
| Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: не позднее 5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения электронного аукциона | | |
| **Условия оплаты предмета электронного аукциона: не позднее 5 (пяти) рабочих дней** со дня подписания договора купли-продажи. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества | | |
| Электронный аукцион проводится в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенном по адресу: https://iintorgi.by | | |
| Победитель электронного аукциона либо единственный участник электронного аукциона, согласившийся повысить начальную цену предмета электронного аукциона на 5 %, обязан возместить организатору электронного аукциона затраты на их проведение и оплатить оператору ЭТП вознаграждение в размере **3 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения электронного аукциона, но не менее 200,00 бел. руб.** | | |
| Организатор электронного аукциона имеет право снять предмет электронного аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения электронного аукциона | | |
| **Дата и время проведения электронного аукциона:** 20.10.2025, начало электронного аукциона: 10.00, окончание электронного аукциона: 16.00, электронный аукцион продлевается на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания электронного аукциона. Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 09.10.2025 по 17.10.2025 г. до 15.00 | | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** | |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)*
по поручению **ОАО «Минoблавтотранс» филиал «Автобусный парк № 1»**
*(продавец, местонахождение: Минская область, г. Солигорск, Любанское шоссе, 22)*
проводит открытый аукцион по продаже

**автомобиля грузового специального фургона изотермического GAZ-3309,**
**2008 г. в., регистрационный знак АЕ 62535-5, рама №Y3933090080007136/33090080964984,**

**находящегося по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Любанское шоссе, д. 22.**

**Начальная цена с НДС (20 %) – 9 600,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены **– 960,00 бел. руб.**

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.

Условия аукциона:

- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведения данного платежа;

- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ;

- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учет приобретаемого имущества за свой счет.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере: 10 (десяти) процентов от цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенном по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 09.08.2025.

Электронные торги состоятся **23.10.2025** в **10.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.10.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64.**
**Тел. для осмотра (8044) 543-84-60.**

УНП 601070315

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

# РАСПРАЦАВАНА МАЛАДЫМІ



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

## Пакаштуйце «Грэчневы» грыльяж

Так, маладыя даследчыкі з Магілёва прапануюць папоўніць рацыён беларусаў грыльяжам «Грэчневым». Асаблівасць распрацоўкі ў тым, што прадукт можа выраблящца на аснове мясцовай сыравіны, пры гэтым па смаку будзе падобны на аналагі, якія выпускаліся з выкарыстаннем арэхаў і сланечніка. Для павелічэння яго карыснасці прапануецца выкарыстоўваць прарошчаную грэчку. Як расказала аспірантка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта харчовых і хімічных тэхналогій Ліяна Шустава, сёння, калі людзі сталі больш клапаціцца пра сваё здароўе і стаў расці попыт на біялагічна-актыўныя дабаўкі, прадукты на аснове прарошчанага зерня сталі надзвычай запатрабаванымі. Пры ўніверсітэце дзейнічае лабараторыя. На базе навукова-тэхналагічнага цэнтра «Тэхнастарт» можна і прарошчваць зерне, і вырабляць новую прадукцыю. Гэта могуць быць прысмакі накшталт грыльяжу і казінакаў, напоі, хлеб. Адна з распрацовак, якой ганарыцца ўніверсітэт — хлеб «Моц злакаў» з павялічанай харчовай каштоўнасцю і ўнікальным збалансаваным складам амінакіслот. Заўважыўшы, што пры выпечцы прарошчанае зерне падсыхае, даследчыкі ўніверсітэта знайшлі ўнікальнае вырашэнне праблемы. Высветлілася, што пасля ферментацыі зерне застаецца мяккім, смачным. «Я ўпэўнена, што наша перамога з грыльяжам «Грэчневым» — не апошняя, будзем і надалей працаваць над распрацоўкай здаровых і даступных па кошце прадуктаў, — заўважыла Ліяна Шустава. — Беларусь — аграпрамысловая краіна, Прэзідэнт удзяляе вялікую ўвагу пытанням імпартазамяшчэння, і таму выкарыстанне ўласнай сыравіны пры вырабе прадуктаў для нас надзвычай важнае».

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Праверана на палігоне і над полем

Калектыў даследчыкаў Ваеннай акадэміі працаваў над эксперыментальным комплексам супрацьдзеяння беспілотным лятальным апаратам. Гэта распрацоўка дазваляе як выяўляць, так і знішчаць беспілотнікі на далёкіх рубяжах. Як расказаў дацэнт Ваеннай акадэміі, маёр Ілья Дубовік, эксперыментальны комплекс ужо правераны ў рабоце на палігонах. У будучым плануецца стварыць лабараторыю па яго вытворчасці і выкарыстоўваць распрацоўку ў абаронным комплексе нашай краіны.

У Беларусі беспілотныя лятальныя апараты шырока выкарыстоўваюцца ў мірных мэтах. Распрацоўка маладых вучоных Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук па біярэсурсах дазволіць знайсці ім прымяненне для выяўлення месцаў распаўсюджвання інвазійных раслін. Калі чалавеку фізічна цяжка паспець за кароткі час аб'ехаць вялікія плошчы і выявіць усе месцы, дзе «пасяліўся» сумнік, дык беспілотнік можа з аднаго месца весці маніторынг на тэрыторыі ў радыусе двух-трох кіламетраў. Акрамя таго, дзякуючы новым тэхналогіям можна выявіць новыя зоны, занятыя інвазійнымі відамі і зрабіць барацьбу з імі больш эфектыўнай.

## Патрыятычная «настолка»

Калектыў маладых гісторыкаў да 80-годдзя Перамогі вырашыў прапанаваць новы падыход для знаёмства школьнікаў з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Ім распрацавана настольная гульня «Шлях герояў. Беларускія партызаны». Класічная «настолка» з картай і кубікам насамрэч можа быць добрым інструментам, з дапамогай якога школьнікі атрымаюць веды пра камандзіраў партызанскіх атрадаў — Герояў Савецкага Саюза, дзейнасць партызанскіх атрадаў, пра тое, што ў гады акупацыі на тэрыторыі Беларускай рэспублікі дзейнічалі партызанскія аэрадромы. Нават гульнявое поле — прадукт навуковых даследаванняў. Вучоныя ўзялі звычайную карту са школьнага падручніка і дапоўнілі яе на аснове архіўных дакументаў, гісторыяграфіі. На карце пазначаны ўсе партызанскія зоны, школьнікі адразу атрымліваюць уяўленне пра тое, што партызанскі рух насіў масавы характар. Гульня была прадстаўлена падчас Фестывалю навукі, які прайшоў у Мінску. Дзеці ацанілі новую форму для атрымання ведаў. Маладыя гісторыкі спадзяюцца, што іх распрацоўка будзе запатрабаванай у школах і ўстановах дадатковай адукацыі. Яны ўпэўнены, што такім чынам можна знаёміць сучасных школьнікаў і з іншымі падзеямі і тэмамі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ВЫБАР ЗА МАЛАДЫМІ

## ЦВК плануе пашыраць кола пагружанай у электаральную тэматыку моладзі

У Цэнтральнай выбарчай камісіі Беларусі адбылося першае пасяджэнне новага складу Маладзёжнага савета пры ЦВК. Гэтае грамадскае фарміраванне ўпершыню было створана ў 2023 годзе. Згодна з палажэннем, яно ўтвараецца на два гады.




Маладзёжны савет — пастаянна дзейны дарадчы, кансультатыўны орган, які закліканы садзейнічаць павышэнню прававой культуры выбаршчыкаў, павышэнню электаральнай актыўнасці моладзі, фарміраванню яе ўсвядомленай цікавасці да ўдзелу ў кіраванні справамі грамадства і дзяржавы.

«Склад Маладзёжнага савета поўнасцю абноўлены не выпадкова. Мы хочам і ў далейшым пашыраць кола маладых людзей, якія будуць пагружаны ў электаральную тэматыку і прымуць актыўны ўдзел у распаўсюджванні адпаведных ведаў», — адзначылі ў ЦВК.

Ранейшым складам Маладзёжнага савета за два гады напрацаваны даволі нядрэнны вопыт: праведзены цікавыя і змястоўныя мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне электаральнай культуры моладзі, вызначаны эфектыўныя метады работы, запушчаны тэлеграм-канал «Выбар.by». А фармат зносін па прынцыпе «роўны навучае роўнага» даказаў сваю папулярнасць. Члены Савета ўдзельнічалі ў маладзёжных праектах, у тым ліку на міжнародным узроўні, у валанцёрскім руху ў перыяд правядзення выбараў.

Як паказвае практыка, удзел у рабоце Маладзёжнага савета дазваляе маладым людзям не толькі вывучаць выбарчае заканадаўства і тэхналогіі, удзельнічаць у мерапрыемствах, якія праводзяцца ЦВК, у тым ліку на міжнародным узроўні, але і развіваць такія асобасныя якасці, як арганізатарскія здольнасці, аратарскае майстэрства, камунікатыўныя і крэатыўныя навыкі, матывацыя да самаразвіцця.

Веды, якія юнакі атрымліваюць, працуючы ў складзе Маладзёжнага савета, дапамогуць у далейшым прафесійным станаўленні і развіцці, а таксама могуць быць выкарыстаны ў працэсе вучобы, напісанні навукова-даследчых работ, прафесійнай і грамадскай дзейнасці, выказаў упэўненасць.

Таксама на пасяджэнні, якое прайшло ў рамках II Міжнароднага электаральнага форуму, на пасаду старшыні Маладзёжнага савета выбраны Мікіта Глаз.

**Па матэрыялах БелТА.**

*Куды пайсці вучыцца?*

# ІНЖЫНЕРЫ КРАІНЕ ПАТРЭБНЫ

## 77 працэнтаў выпускнікоў інжынерных класаў паступілі на профільныя спецыяльнасці

Такія даныя прывёў міністр адукацыі Андрэй Іванец. «Падрыхтоўка інжынерных кадраў для эканомікі, прамысловасці — важны элемент тэхналагічнай бяспекі краіны. У нас дастаткова добра і сістэмна выбудавана прафарыентацыйная работа, пачынаючы са школьнай парты. Больш як 6,5 тыс. хлопцаў і дзяўчат цяпер вучацца ў 10-х і 11-х профільных інжынерных класах».

Кожны з іх замацаваны за тэхнічным універсітэтам — сталічным ці рэгіянальным. Сёлета быў першы выпуск інжынерных класаў, і 77 % дзяцей паступілі на профільныя спецыяльнасці. Гэта самы высокі працэнт з усіх профільных класаў. Для параўнання: узровень паступлення па профілі ў педагагічных — каля 30 %, аграрных — 13 % і інш. «Улічваючы, што гэта першы выпуск, можна сказаць, што выйшаў ён удалым. Безумоўна, работу трэба сістэмна працягваць», — акцэнтаваў Андрэй Іванец, адзначыўшы плюсы механізму падрыхтоўкі інжынерных кадраў.



У пытанні падрыхтоўкі кадраў сістэма адукацыі працуе выключна на заказ рэальнага сектара эканомікі, сказаў міністр. «Важна, каб работы і праекты, якія выконваюць адораныя і таленавітыя вучні, былі карыснымі для вытворчасці. Выпускнікі ж Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка — гэта своеасаблівы залаты фонд, які будзе гатовы ў далейшым прыйсці працаваць на прадпрыемствы», — растлумачыў ён.

Міністр адукацыі выказаў упэўненасць у тым, што і выпускнікі ВНУ на апошніх курсах, якія заканчваюць універсітэт, могуць працаваць. «Ёсць розныя варыянты з частковай або поўнай занятасцю праз складанне індывідуальнай праграмы навучання ў ВНУ. Такая практыка ў першую чаргу вырашае пытанне з праславутым размеркаваннем, якое ў працэсе чакання (вызначэння першага месца працы. — **«Зв».**) часам успрымаюць як карную меру. Пры такім падыходзе бачым планамерны працяг працоўнай дзейнасці, якую выпускнік пачаў яшчэ падчас вучобы. І калі надыходзіць час размеркавання, ён кажа, што ўжо год працуе на прадпрыемстве і хоча туды размеркавацца. Пытанняў з гэтым не ўзнікае», — адзначыў Андрэй Іванец.

У цэлым, як абазначыў кіраўнік ведамства, практыка-арыентаванае навучанне развіваецца па трох напрамках: «Па-першае, гэта цэнтры кампетэнцый. Бачым актыўную пазіцыю па названай тэме і прамысловых прадпрыемстваў. Па-другое, стварэнне навучальных майстэрняў на базе вытворчасцяў. Гэта даручэнне нашага Прэзідэнта, якое прагучала на рэспубліканскім педагагічным савеце. Сёлета на 55 прадпрыемствах або стварылі, або завяршаюць гэты працэс. І трэці напрамак — прыцягненне практыкаў з прадпрыемстваў, каб выкладаць або ва ўніверсітэтах, або ў каледжах».

**Паводле БелТА.**

*Адукацыя*

# ПАЧАТАК ВЯЛІКАЙ КАМПАНІІ

## Стартаваў першы этап рэпетыцыйнага тэсціравання для падрыхтоўкі да ЦЭ і ЦТ 2026 года

Навучальны год толькі пачаўся, і да яго фінішу яшчэ доўгія тры з паловай чвэрці, а старт новай уступнай кампаніі ўжо абвешчаны — у кастрычніку пройдзе першы этап рэпетыцыйнага тэсціравання (РТ) для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага экзамену і цэнтралізаванага тэсціравання 2026 года.

Рэпетыцыю можна будзе прайсці па 14 вучэбных прадметах за курс агульнай сярэдняй адукацыі ў тры этапы: першы, як мы згадалі вышэй, пройдзе з кастрычніка да снежня 2025 года, другі — у студзені і лютым 2026-га, а заключны, трэці, этап намечаны на сакавік—красавік наступнага года. У Міністэрстве адукацыі нагадалі, па якіх прадметах можна прайсці тэст. Гэта руская і беларуская мовы, фізіка, матэматыка, хімія, біялогія, шэраг замежных моў — англійская, нямецкая, французская, іспанская і кітайская, гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі, грамадазнаўства, геаграфія.

Пералік устаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь, на базе якіх можна прайсці рэпетыцыйнае тэсціраванне, будзе



размешчаны на сайце РІКВ пасля заключэння з імі дагавораў. Кожны пункт вызначае свой графік правядзення і колькасць удзельнікаў рэпетыцыйнага тэсціравання па вучэбных прадметах. Актуальная інфармацыя па ўсіх даступных сеансах рэпетыцыйнага тэсціравання размяшчаецца ў асабістым кабінеце ўдзельніка тэсціравання на сайце РІКВ. Там жа, у асабістым кабінеце, з'яўяцца і вынікі РТ: у 20-х чыслах снежня — першага этапу, у 20-х чыслах лютага — другога этапу і ў 20-х чыслах красавіка — трэцяга этапу. У асабістым кабінеце на сайце РІКВ абітурыенты таксама змогуць атрымаць рашэнне заданняў тэста для правядзення работы над памылкамі.

### Вузельчык на памяць

